№110 (1923)
Пятніца, 18 чэрвеня 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец: УП «Народная воля»
Кошт свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +9...+11, дождж, уначы — +9...+11, без ападкаў; у Брэсце ўдзень — +13...+15, дождж, уначы — +10...+12, без ападкаў; у Гродне ўдзень — +11...+13, дождж, уначы — +9...+11, без ападкаў; у Віцебску ўдзень — +13...+15, дождж, уначы — +8...+10, дождж; у Гомелі ўдзень — +19...+21, уначы — +10...+12, на працягу сутак — без ападкаў; у Магілёве ўдзень — +10...+12, дождж, уначы — +10...+12, без ападкаў.

www.meteo.by

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ
пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

SOS!

Зінаіда БАНДАРЭНКА:

«Я малюся за іх!»

Галадоўка: дзень шаснаццаты

Нягледзячы на шматлікія звароты спыніць галадоўку, адрасаваныя не ўдзельнікам, акцыя пратэсту працягваецца. Акрамя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Валерыя ФРАЛОВА, Уладзіміра ПАРФЯНОВІЧА і Сяргея СКРАБЦА, а таксама актывістаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі і Грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" Марыны БАГДАНОВІЧ, Генадзя АНАНЬЕВА, Уладзіміра ЧЫРВОНЕНКІ, Юрыя ІСТОМІНА, Уладзіміра РАДЗІВОНЧЫКА і Віктара ІВАШКЕВІЧА (г. Мінск) у Беларусі галадаюць Зміцер ЧАРТКОЎ (г. Жодзіна), Уладзімір ЦЫБУЛЬСКІ, Аляксандр ЦЯРЭНЦЬЕЎ і Ігар СУХАРУКАЎ (г. Наваполацк), віцябчане Эла КАНАВАЛАВА, Фёдар БАКУНОЎ, Таццяна ЗАЙКОВА, Іна СЯТКОЎСКАЯ, Лідзія ФРАНЦАВА, гамяльчанін Віктар КУРЛУКОЎ.

На чарговай прэс-канферэнцыі, якія ладзяцца штодзень ля пад'езда дома на зав. Казарменным у Мінску, Валеры Фралоў заявіў, што, згодна з яго інфармацыяй, 26 чэрвеня можа быць зменена мера стрымання Міхаіла Марыніча. (Нагадаем: адно з патрабаванняў галадоўшчыкаў — вызваліць з-за кратаў Марыніча). Са слоў генерала не вынікала, ці працягнуць галадоўшчыкі сваю акцыю ажно да 26 чэрвеня (не трэба мець медыцынскай адукацыі, каб зразумець, што да гэтага дня можа здарыцца трагедыя!). На пытанне аб спыненні галадоўкі генерал-дэпутат адказаў, што на іх "палітбюро" гэта пакуль не разглядалася.

Фралоў пажартаваў пра парадкі ў "палатцы", што тычацца атрымання там заробкаў. *"Днямі быў дзень палучкі ў парламенце,* — сказаў В. Фралоў, — *мая памочніца доўга сядзела, чакала, пакуль грошы выдавалі. Хтосьці ўсё кудысьці тэлефанаваў, нешта ўдакладняў — даваць нам грошы альбо не. Так і не вырашылі... Ну, калі не дадуць, мы проста напішам заяву: няхай аддадуць тыя грошы людзям, якія маюць патрэбу".*

Валеры Фралоў з захапленнем распавёў пра 80-гадовую жанчыну Ігнацьеўну, якая на сваю жабрачую пенсію набыла пяць кніг доктара Канавалава пра галаданне і прынесла іх на Казарменны завулак. А потым павярнуўся да аб'ектыва камеры Беларускага тэлебачання і перадаў прывітанне ... Лукашэнку: *"Я ведаю, Аляксандр Рыгоравіч, што вы кожны дзень глядзіце тэлезапісы з галадоўкі* (у адрозненне ад тэлегледачоў, якім іх не паказваюць, — **А.С.**). *Спадзяюся, хутка мы ўбачымся і зможам абмеркаваць усе праблемы,* — выказаўся В.Фралоў.

Дэпутат Сяргей Скрабец дадаў, што здароўе галадоўшчыкаў за апошнія дні пагоршылася — *"зноў прыйшлося выклікаць "хуткую дапамогу". Галадаць, канешне, цяжка".* На пытанне як успрынялі яны наведванне галадоўшчыкаў замежнымі паслами С.Скрабец адказаў: *"Мы лічым, як і нашы высокія госці, якія раілі спыніць галадоўку, што нам трэба скіроўваць усе сілы для працы на карысць краіны. Але ... прыпыніць галадоўку пакуль не можам". "Здохнуць, па праўдзе, не хочацца,* — эмацыйна падключыўся В. Фралоў, — *асабліва калі ўлічыць, што планаў у нас "громадзе".*

Кожны дзень генералу Фралову перадаюць стос лістоў ад грамадзян. Сам дэпутат іх чытаць усе не паспявае, — дапамагаюць паплечнікі. Кожны дзень нясуць кветкі — увесь балкон застаўлены. Больш за ўсіх іх прызначана адзінай жанчыне-галадоўшчыцы Марыне Багдановіч, але і мужчынам перападае. *"Можа, Марына калі-небудзь і атрымлівала столькі кветак, а я — не",* — жартуе В. Фралоў...

Напярэдадні, у сераду, прыйшло трывожнае паведамленне ад галадоўшчыкаў з Віцебска. Дзень пачаўся з таго, што адна з удзельніц галадоўкі, Лідзія Францава, адчула сябе блага і выйшла на свежае паветра. *"Неўзабаве,* — як сцвярджаецца ў прэс-рэлізе дэпутацкай групы "Рэспубліка", — *яна згубіла прытомнасць, і прахожыя выклікалі "хуткую дапамогу". Яе сяброўкі папрасілі ў медыкаў дазволу паехаць разам з Л. Францавай у бальніцу. Пакуль яны зачынялі кватэру, "хуткая" вельмі хутка з'ехала. Прыблізна паўтары гадзіны паплечнікі Лідзіі Францавай званілі ў медыцынскія ўстановы горада, каб даведацца, куды яе адвезлі. Пошукі былі безвыніковымі. А неўзабаве медыкі паведамілі, што Л. Францаву адвезлі ў... псіхіятрычную бальніцу. Але і там яе не аказалася. Праз паўтары гадзіны Францаву знайшлі ў гарадской бальніцы, адкуль яе сапраўды хацелі адправіць у псіхіятрычку... На якой падставе — невядома, як і тое, хто стаяў за гэтым, бадай, дэтэктыўным сцэнарам. Сябрам Лідзіі Францавай літаральна ў апошнюю хвіліну ўдалося забраць яе дамоў".*

Водгукі на гэтую агульнарэспубліканскую галадоўку прыходзяць з боку вядомых і невядомых грамадзян Беларусі. Вось толькі некаторыя з іх:

Зінаіда Бандарэнка, народная артыстка Беларусі:

— Я вельмі ўзрушана ўчынкам гэтых людзей — галадоўшчыкаў. Толькі б яны вытрымалі!... Здзіўляе і тое, што галадоўка не кранае нашы ўлады, што дэпутаты парламента ўнеслі пытанне аб змяненнях у Выбарчы кодэкс толькі на 22 чэрвеня. Да гэтага часу здароўе галадоўшчыкаў можа быць сур'ёзна падарвана. Хочацца пажадаць здароўя, духоўных і фізічных сіл гэтым мужным людзям. Я малюся за іх! За кожнага...

Лічу, што яны пайшлі на апраўданую рызыку. Гэтая падзея застанецца ў гісторыі. Можа, і наша застойнае балота нейкім чынам удасца ўскалыхнуць.

Анатоль Лябедзька, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП):

— Сённяшняя галадоўка паказвае, наколькі палярным стала наша грамадства. З аднаго боку, толькі на офіс АГП штодзённа прыходзяць сотні лістоў падтрымкі ад жыхароў Беларусі. Гэта не проста подпісы "ў падтрымку", гэта вельмі эмацыянальныя, напісаныя з любоўю лісты. У адным лісце нават літары размыты слязамі. Як вядома, патрабаванні галадоўшчыкаў маюць палітычны характар, і многія баяцца адкрыта іх падтрымоўваць. І сёння як ніколі раней пачынаеш разумець, што сённяшняя сістэма забівае ў людзях грамадзянскую пазіцыю...

Генадзь Коп'еў, грамадзянін Беларусі:

— Стаўленне да людзей, якія абвясцілі галадоўку, самае паважлівае. Крыўдна, што многія проста не ведаюць пра галадоўку. Чаму б не наладзіць ланцуг нераўнадушных людзей у падтрымку патрабаванняў галадаючых?... Я ўжо некалькі дзён прыходжу да іх, стараюся хоць нечым дапамагчы, вось сёння мыла гаспадарчае ім прынёс...

Як вядома, яшчэ ў аўторак кіраўніку дзяржавы быў адпраўлены ліст ад галадаючых дэпутатаў, поўны тэкст якога друкавала "Народная воля". У сераду, па падліках прэс-службы дэпутацкай групы "Рэспубліка", ліст павінен быў легчы на стол А.Лукашэнкі. У чацвер Аляксандр Рыгоравіч адправіўся ў Астану (Казахстан) на пасяджэнне ЕўраЗЭС. Наконт таго, ці прачытаў ён пасланне ад Фралова і, што самае галоўнае, ці збірасцца на яго рэагаваць, прэзідэнцкая прэс-служба маўчыць.

Цяпер аб медыцынскім баку галадоўкі. **Уладзімір Чырвоненка,** доктар, які галадае разам з іншымі, пазнаёміў "Народную волю" з вынікамі апошняга медагляду на поўдзень 17 чэрвеня: *"Усё застаецца пакуль, як і было ў мінулыя дні, скаргаў асаблівых няма".* Што ж, як кажуць англічане, адсутнасць навінаў — гэта ўжо добрая навіна!

Некаторыя калегі Фралова, Скрабца і Парфяновіча з Палаты прадстаўнікоў, якія не ўдзельнічаюць у галадоўцы і з'яўляюцца суседзямі па доме, усё яшчэ цягнуць незразумелую паўзу, не выказваюцца ўслых (а толькі паціскаюць руку пры сустрэчы). Дзе ж іх карпаратыўная салідарнасць? Яны, мусіць, альбо вырашылі згуляць у маўчанку, альбо дружна ўпалі ў спячку. Мядзведзі, як вядома, таксама зімой упадаюць у спячку. Але ж зараз не зіма!

Алесь СІЛІЧ.
Фота photo.bymedia.net.

P.S. *Як стала вядома ў апошнюю хвіліну, акцыю галадоўшчыкаў вырашылі падтрымаць прадпрымальнікі Беларусі. Учора, 17 чэрвеня, яны распачалі агульнанацыянальную акцыю пратэсту. Як паведаміў на спецыяльна скліканай прэс-канферэнцыі старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Перспектыва" Анатоль Шумчанка, з учарашняга дня, вылучаючы "не толькі эканамічныя, але і палітычныя патрабаванні", прыпынілі працу ў Мінску рынак у Ждановічах, на 80% — рынак "Дынама".*

Як сцвярджае А.Шумчанка, не працуюць рынак у Бабруйску, тры рынкі ў Пінску ("Цэнтральны", "Звездный" і "Солнечный"), рынкі ў Жодзіне, Лепелі, Рэчыцы, Светлагорску і г.д. Зараз на прадпрымальнікаў, асабліва ў Мінску, паведаміў ён, з боку ўладаў ідзе моцны ціск. Тым, хто не выходзіць на працу, пагражаюць скасаваннем кантракту.

ПИСЬМО ИЗ-ЗА ОКЕАНА

Джон МАККЕЙН, сенатор:

«Вы вдохновляете всех, кто любит демократию!»

Дорогой генерал Фролов!

Я узнал о Вашем недавнем решении начать голодовку протеста против действий режима Лукашенко. Вы вместе с Вашими коллегами из группы "Республика", Белорусского Народного Фронта и Объединенной гражданской партии являетесь замечательным примером моральной смелости и решимости. Вы вдохновляете всех, кто любит демократию, и нас в США, кто выражает солидарность с Вами.

Ваши усилия по освобождению Михаила Маринича из тюрьмы, по изменению законодательства, которое бы обеспечивало справедливые выборы, и к предотвращению попыток Лукашенко манипулировать Конституцией, — все это иллюстрирует благородство Ваших действий. Ясно, что Вы достигнете результата. Президент Лукашенко боится вашей группы и продемократических сил Беларуси.

На прошлой неделе мы простились с Рональдом Рейганом, человеком, который посвятил свою деятельность на посту президента борьбе за свободу и демократию для всех людей. Ваша борьба за свободу также вызывает нашу поддержку. Вы остаетесь в наших мыслях и молитвах.

Желаю удачи, мой друг, и так как Вы продолжаете Вашу борьбу, никогда не забывайте, что мы мысленно с Вами. Желаем Вам победы в Вашей борьбе за честь, демократию и лучшую жизнь для белорусского народа.

Искренне Ваш,
сенатор США
Джон Маккейн.

КОНКУРС

Польшча — прыязная суседка Беларусі

Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь аб'яўляе V конкурс для журналістаў "Польшча — прыязная суседка Беларусі". У конкурсе могуць прыняць удзел журналісты, якія да 20 снежня 2004 года выслюць на адрас Пасольства РП копіі публікацый, а таксама радыё- і тэлематэрыялаў (з указаным месцам і датай публікацыі) за 2004 год на наступныя тэмы:

— Сучасная Польшча.
— Супольная гістарычная спадчына Беларусі і Польшчы.
— Значэнне членства Польшчы ў Еўрапейскім Саюзе для інтэграцыі Беларусі з Еўропай.
— Польскія органы самакіравання як падмурак рэгіянальнага дэмакратычнага развіцця.
— Роля свабодных сродкаў масавай інфармацыі і пазаўрадавых арганізацый у Польшчы.
— Польска-беларускае эканамічнае супрацоўніцтва.

Матэрыялы просім высылаць на адрас:
220034 Мінск, вул. Румянцава, 6 з паметкай: "Конкурс".

Узнагароды:
першае месца — 250 долараў ЗША;
два другія месцы — 200 долараў ЗША;
тры трэція месцы — 150 долараў ЗША;
5 прэмій — 100 долараў ЗША;
10 прэмій — 50 долараў ЗША.

Прэс-служба Пасольства.

Требования граждан Беларуси к Национальному собранию

Мы, граждане Беларуси, выражаем свою солидарность с требованиями голодающих депутатов Валерия Фролова, Сергея Скребца и Владимира Парфеновича, а также представителей Народной коалиции **"5+"** Марины Богданович, Геннадия Ананьева, Владимира Червоненко, Юрия Истомина, Владимира Радивончика, Виктора Ивашкевича, Эллы Коноваловой, Инны Сятковской, Татьяны Зайковой, Федора Бокунова, Лидии Францевой, Александра Терентьева, Игоря Сухорукова и Владимира Цыбульского. Они выступили в защиту справедливости и наших интересов. Чтобы не допустить обмана избирателей, сделать выборы свободными и справедливыми, они требуют изменения избирательного законодательства. Мы поддерживаем их требования и призываем депутатов Национального собрания незамедлительно принять предложенные ими поправки в Избирательный кодекс.

Ф.И.О	Место жительства	Подпись

Уважаемые граждане!
Заполненные анкеты отправляйте в офис Объединённой гражданской партии (по мере поступления они будут передаваться в Национальное собрание Республики Беларусь).
Адрес: 220123, г.Минск, ул. В. Хоружей, 22, каб.1701. Телефон для справок: 289-50-09.

Кватэры для ветэранаў

Мінскі гарвыканкам прыняў рашэнне накіраваць з гарадскога бюджэту сродкі на будаўніцтва ў сталіцы 215 кватэр для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі ў гарадской адміністрацыі намеснік старшыні гарвыканкама Вячаслаў Кушнер, у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у Мінску знаходзяцца больш за 1.000 ветэранаў, для якіх за апошнія пяць гадоў было пабудавана не больш за 200 кватэр. Сёлета ў горадзе спачатку планавалася пабудаваць 65 кватэр для гэтай катэгорыі грамадзян, але ў пачатку чэрвеня было прынята рашэнне аб выдаткаванні сродкаў на будаўніцтва ў мікрараёне Чырвоны Бор двух дамоў на 150 кватэр. Больш за тое, за кошт сродкаў гарадскога бюджэту прадугледжваецца ўзвесці яшчэ 300 кватэр, што, як сказаў В.Кушнер, "дазволіць нам выканаць свой абавязак перад ветэранамі".

Намеснік старшыні гарвыканкама зазначыў, што ў цэлым рэзкае павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля стала асноўным пытаннем сацыяльнай палітыкі на гэты год, бо сваёй чаргі на атрыманне кватэр чакаюць 134 тысячы сем'яў.

Лавінія АРЭШКА.

У гонар 80-годдзя Васіля Быкава

18 чэрвеня, пятніца, 18.00

Вечарына Саюза беларускіх пісьменнікаў у гонар Вялікага творцы (Дом літаратара, вул.Фрунзе, 5).

19 чэрвеня, субота, 12.30

Ушанаванне магілы Быкава на Усходніх могілках. (Станцыя метро "Усход", выхад у бок вул. Каліноўскага).

Управа Партыі БНФ.

Светлана АЛЕКСИЕВИЧ

Новые маски зла

Этот материал известная писательница Светлана АЛЕКСИЕВИЧ написала специально к открытию Европейской женской академии, которая уже в третий раз проводилась в Минске. К сожалению, сама С.Алексиевич в Минск приехать не смогла, поэтому данный текст был озвучен заочно. Полагаем, что он представит интерес и для читателей "Народной воли".

В течение десяти лет я писала свою книгу о Чернобыле, самом необычайном событии XX века. Отныне мы навсегда оставили мечту о будущем без зла, о лучшем будущем: мы живем в мире, где повсюду находят следы воплощения ЗЛА, где ЗЛО облекается в новые маски, где Манхеттен становится в один ряд с Чернобылем...

В течение всех десяти лет я писала дневник, некоторые отрывки из которого вошли в мою книгу **"Чернобыльская Молитва"**, а несколько других никогда не публиковались. Этот дневник представляет собой ценнейшее свидетельство всего пережитого и чувств, которые испытали люди в первые дни и месяцы после катастрофы... Свидетельство встречи человека-предшественника Чернобыля с человеком Чернобыля.

"Горит ядерный реактор... Правительственные газеты долго хранили молчание, а теперь они бессовестно лгут. Лозунги и призывы победить мирный атом в духе Второй мировой войны, несмотря на полувековую дистанцию, зазвучали снова. Газеты запестрели заголовками: *"Атом побежден", "Подвиг Чернобыля", "Как закаляется советский характер"* и другие. А параллельно тайком слушаем трансляции американского Радио Свобода и обмениваемся информацией, шепотом, на ушко. Бегаем по аптекам в поисках йода: эти рекомендации даются по радио, но никак не нашими медиками. Последние советуют не поддаваться панике и не верить информации "вражеского радио". В то же время все прекрасно знают, что некоторые из них принимают необходимые меры защиты у себя дома и рекомендуют их своим близким. Что же случилось с клятвой Гиппократа? Один мой друг заметил: *"У нас нет ни докторов, ни учителей, ни ученых, ни журналистов, у нас есть только одна профессия — советский человек..."*.

Нас запустили в космос, в новую реальность. Но мы всегда остаемся сами собой.

Вчера мне позвонил мой отец (он преподавал историю в течение 40 лет в одной сельской школе): *"Это несомненно диверсионная работа секретных западных служб. КГБ ведет уже расследование по случившемуся на ЧАЭС. Шпионы и саботажники будут найдены. Советское правосудие их накажет"*.

Мой дорогой папа... С ним, конечно, можно поговорить о молодом саде, который он посадил этой весной, но никак не о правительстве; о рыбной ловле и о Петре Великом, но не о коммунизме; о жизни и смерти вообще, но не о том, что с нами сейчас происходит.

Папа и мама живут в деревне, которая находится в 100 километрах от Чернобыля...

На этой неделе я услышала, как одна соседка, женщина-инженер, рассказывала жителям нашего дома: *"На товарной станции в вагоны грузят трупы сгоревших людей и животных. Это необычные трупы, не черные, а розовые. Их вывозят в Сибирь и там хоронят"*.

Каким-то странным образом к нам возвращается прошлое: во времена Сталина в Сибирь отправлялись вагоны с заключенными, чтобы заполнить ими ГУЛАГи.

Самый интересный вопрос во время одной из моих поездок в зараженную зону был задан мне мальчиком 5 лет: *"Извините, пожалуйста, Вы пишете книги и сами прочитали много книг. Скажите, у рыб будут дети? Смогут ли птицы иметь своих птенчиков? И наша корова Роза, родит ли она своего теленка?"*.

Захваченные врасплох, мы были вытолкнуты в новую реальность. Как объяснить то, чего мы не могли представить.

Еще совсем недавно официальная пропаганда провозглашала: *"Благотворное действие мирного советского атома — в каждый дом!"* Сегодня этот клич стал уже ужасающей действительностью. Академик Александров, "отец" наших атомных электростанций, часто повторял (и мы в это верили), что каждая атомная электростанция надежна до такой степени, что можно было бы их построить в центре Москвы, на Красной площади. Эти станции, — говорил он, — были так же безопасны, как и самовары, и также легки в эксплуатации.

Мы боялись ядерной войны, ядерной бомбы. Никто еще и не подозревал, что военный и мирный атом были союзниками, заговорщиками. Сегодня ясно было одно: образ врага изменился. Несмотря на все наши попытки спрятаться, включая нас самих, больше уже ничто не сможет нас защитить. Ни одна технология не послужит нам щитом. Катастрофы не являются больше продуктом случая, они — продукт нашей цивилизации.

В книгах и кино часто показывали Апокалипсис, но реальность оказалась более фантастической. Во время моего первого пребывания в зараженной зоне я вдруг поняла, что боюсь всего того, что ранее было добрым и безобидным. Я боялась съесть яблоко, прислониться к дереву, присесть на траву. Все было, как раньше, — формы, цвета, запахи, названия — но это был уже иной мир. Иное пространство. Мир, в котором все могло меня убить: земля, вода, ягоды, дождь... ветер... Я находилась в противостоянии новым ликам зла. Смерть бродила вокруг, наряженная в одежды, которые я не знала. Она пряталась... И весь наш прошлый опыт страха становился бесполезным. Все наши средства защиты были бессильны: это зло, его нельзя было потрогать, увидеть, услышать, понюхать, почувствовать, попробовать — наши глаза, наши уши, наши пальцы не могли ничего поделать. Смерть просочилась повсюду. Она была королевой.

Реальность исчезает, скрывается. Как понять, где мы находимся. Что здесь происходит... сейчас... с нами... со мной...

Можно было бы выразить одним словом, что мы переживаем в этот момент: страх. Страх — это кто-то, кто живет в нас отдельным существом, незнакомец. Страх — это возможность очутиться вне границ нашей жизни, традиционной физики, культуры. Во время моих путешествий при встречах с людьми, в разговорах, я слышу одно и то же: *"Я никогда не читал ничего подобного", "Никто никогда мне об этом не говорил", "Я никогда не видел такого даже в кино"*. Должностные лица в компартии от самых высоких до самых низких, генералы и полковники, солдаты, ученые, медики — все в замешательстве.

Я предпочитаю разговаривать с детьми или со старыми крестьянами — спонтанными поэтами и философами, чей внутренний мир лучше выносит испытания.

Для нас сила заключается в признании того, что мы находимся на высоте происходящих с нами событий. Прошлое, которое казалось нам надежным источником (неким универсальным архивом), стало внезапно бессильным. Многие люди ищут утешения в молитвах... Храмы наполнены людьми...

Я прочитала в одной газете, что через 4 дня после катастрофы тучи Чернобыля проплывали уже над землей Африки и Китая. Земля вдруг стала такой маленькой...

Повсюду я слышу абсолютно новые слова. В автобусе, в метро, на своей лестничной площадке. Мы смиряемся с новой реальностью. Я начинаю понимать, что я ее преследую, как детектив. Я слушаю, спешу все записать, мой слух постоянно напряжен, у меня даже иногда возникает впечатление, что я вся целиком стала большим ухом.

Важность того, что происходит, не оставляет никаких сомнений. Две катастрофы произошли в одно и то же время: катастрофа космическая, в Чернобыле и другая — историческая, "потопление" гигантского социалистического континента. Эту, последнюю, легче всего понять, она в распоряжении обычного человека. Бесконечно дискутируют об инфляции, повышении цен, о Ленине (был ли он преступником или русским идеалистом), о Марксе (был ли он прав или нет). Чернобыль же является новой темой, так как в первый раз человек противостоит космосу.

(Окончание на 2-й стр.)

Орхус — гэта вам не Бахус!

У Мінску прадстаўнікі шэрагу палітычных партый і грамадскіх арганізацый падпісалі Дэкларацыю аб партнёрстве для рэалізацыі прынцыпаў Орхускай канвенцыі на тэрыторыі Беларусі.

Падпісанне дакумента адбылося па выніках пасяджэння "круглага стала" на тэму "Орхуская канвенцыя — рашэнне для Беларусі", у якім бралі ўдзел маладыя палітыкі, дэпутаты мясцовых Саветаў і эксперты-эколагі. Сярод тых, хто падпісаў дэкларацыю, — прадстаўнікі Партыі БНФ, Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Ліберальна-дэмакратычнай партыі, грамадскага аб'яднання "Грамадзянскі форум", Беларускага саюза маладзёжных і дзіцячых грамадскіх арганізацый "Рада".

Удзельнікі пасяджэння выступілі за стварэнне назіральнага савета па выпрацоўцы прапаноў для дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу новага склікання. Такі савет прапанавана стварыць пасля правядзення парламенцкіх выбараў. Маладыя палітыкі таксама заявілі пра гатоўнасць садзейнічаць накіраванню ў ніжнюю палату парламента законапраектаў, што тычаць абароны навакольнага асяроддзя і стабілізацыі экалагічнай сітуацыі ў краіне.

Орхуская канвенцыя — "Канвенцыя аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, што тычаць навакольнага асяроддзя" — была зацверджана Указам прэзідэнта Беларусі 14 снежня 1999 года. Гэта азначае, што ў краіне з'явіўся рэальны інструмент, з дапамогай якога кожны грамадзянін можа паўплываць не толькі на якасць вады ў кранах і прадуктаў у крамах, але і ўзяць удзел у распрацоўцы планаў, законаў і палітыкі дзяржавы ў галіне навакольнага асяроддзя. Гарантам гэтага служаць тры асноватворных прынцыпы канвенцыі — доступ да экалагічнай інфармацыі, удзел грамадскасці ў працэсе прыняцця экалагічна значных рашэнняў, а таксама доступ да правасуддзя па пытаннях, што тычаць навакольнага асяроддзя.

Марат ГАРАВЫ.

ЗАКУЛІССЕ

У Беларускай арміі будзе свой тэатр

24 чэрвеня на вялікай сцэне Дома афіцэраў адбудзецца яго афіцыйнае адкрыццё. Чакаецца, што ў мерапрыемстве возьме ўдзел міністр абароны Леанід Мальцаў.

Нядзіўна, што тэатр Беларускай Арміі з'явіўся напярэдадні 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — будзе нагода яшчэ раз сказаць, з якой пашанай улада ставіцца да юбілею вызвалення...

П'есу для прэм'ернага спектакля спецыяльна напісаў **Аляксей Дударaў**. Яна мае назву "Ты помніш, Алёша?" і вяртае гледача ў цяжкія часы абароны Магілёва.

Ці атрымаецца ў Дударава паўтарыць велізарны поспех амаль дваццацігадовай даўніны, калі на сцэне Купалаўскага тэатра адбылася прэм'ера яго знакамітых "Радавых"?

Тады п'еса была прымеркавана да 40-годдзя Перамогі. Малады драматург сказаў пра вайну так, як яшчэ ніхто на сцэне не гаварыў. Гэта была вайна не з выбухамі і стрэламі, а вайна, якая нявечыла людскія душы.

"Радавых" паставілі больш за 100 тэатраў былога Савецкага Саюза. Па ўсёй краіне спектаклі ішлі з аншлагамі. Некаторыя савецкія крытыкі спрабавалі абвінаваціць Дударава ў "пацыфізме", распачалі ў прэсе сапраўдную вайну супраць маладога беларускага драматурга. Аднак стрымаць інтарэс да "Радавых", не прызнаць п'есу было ўжо немагчыма.

Аляксей Дударaў, рэжысёр Купалаўскага тэатра **Валерый Раеўскі**, выканаўцы галоўных роляў — **Віктар Манаеў і Аляксандр Дзянісаў** — атрымалі Дзяржаўную прэмію СССР.

Сёння, на думку крытыкаў, нават "Радавыя" згубілі сваю актуальнасць, тэма вайны ў беларускім мастацтве павінна разглядацца з іншага боку. Аб тым, што вайна знішчала ўсіх і ўся, ведае ўжо кожны школьнік. А вось філасофскага роздуму, гістарызму не хапае. Малады рэжысёр **Андрэй Кудзіненка** паспрабаваў інакш паглядзець на Вялікую Айчынную вайну, і яго фільм "Акупацыя. Містэрыі" забаранілі паказваць у Беларусі... 24 чэрвеня ў нас з'явіцца магчымасць убачыць на тэатральнай сцэне новы твор Аляксея Дударава.

Праўда, квіткі на спектакль "Ты помніш, Алёша", не будуць прадавацца ў тэатральных касах. Прэм'еру змогуць паглядзець толькі ўладальнікі запрашальных білетаў. Іх непасрэдным распаўсюджваннем займаецца Міністэрства абароны. Новы тэатр — адзіны сярод усіх дзяржаўных тэатраў краіны, знаходзіцца ў ведамстве гэтага міністэрства, а не Міністэрства культуры.

Увосень спектакль змогуць паглядзець усе жадаючыя. Да гэтага часу, мяркуе Аляксей Дударaў (***вядомы драматург, дарэчы, з'яўляецца мастацкім кіраўніком новага тэатра.*** — **М.Э.**), скончыцца рамонт другой залы Дома афіцэраў, дзе і будзе размяшчацца тэатр Беларускай Арміі.

"Ты помніш, Алёша" стане дэбютнай работай у тэатры некаторых выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Галоўную ролю ў спектаклі іграе малады акцёр **Яўген Нікіцін**. У пастаноўцы таксама заняты акцёры **Яўгенія Жуковіч, Віктар Молчан, Ігар Фільчанкаў**.

Марыя ЭЙСМАНТ.

На здымку: *Аляксей Дударaў задумаўся: які лёс чакае новы тэатр...*

Светлана АЛЕКСИЕВИЧ

Новые маски зла

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Детали этой катастрофы для меня не так уж и важны: что же в действительности произошло той ночью, кто является ответственным за это, какие были приняты решения, сколько тонн песка и бетона нужно было для строительства саркофага над роговом дьявола?

Я исследую скорее слова людей, охваченных неизвестностью, тайной, завесу которой мы не можем приоткрыть. Я хочу создать историю наших чувств. Как они развивались? Что человек мог узнать о самом себе? Как он приспосабливался к новым границам ужаса? Изменился ли его мир? И его представления о своем месте в этом мире? В этом божественном мире.

До Чернобыля я путешествовала по страданию других. Вторая мировая война, Афганистан, суициды, связанные с крушением Советской империи. С Чернобылем я стала сама участником и свидетелем одновременно. Моя жизнь является частью событий, так как я живу на земле Чернобыля. В маленькой Беларуси, о которой в прошлом мир ни разу не слышал.

Отныне нас знают, так как мы больше не живем в обычной стране, а в лаборатории Чернобыля. Чернобыль вошел в наши жизни на сотни и тысячи лет (такой может быть продолжительность действия некоторых радиоактивных элементов), он будет вечно сопровождать нас.

"Мы — чернобыльцы" — говорят белорусы, как будто они образовали новую нацию, новый народ. Чернобыль стал нашим домом, нашим национальным наследием. Не собирается ли он вытеснить нашу историю, чтобы остаться в общей памяти человечества как его единственное событие? Событие несоизмеримое, которое простирается над нашим миром, которое превышает продолжительность человеческой жизни. Его нельзя охватить, схватить, можно только следовать за ним. Чернобыль — это больше, чем катастрофа... И попытка поместить его в списки подобных катастроф мешает нам обдумать то, что произошло. Чем больше я нахожусь в зараженных областях, чем больше я разговариваю с людьми, тем больше создается у меня впечатление, что я записываю в своей записной книжке не настоящее и прошлое, а будущее.

Вчера, например, я встретила жену одного пожарного **Люсю Игнатенко.** Ее муж работал при тушении пожара на крыше реактора и в здании станции в первую ночь после взрыва. Их было едва более 10 человек, ночная команда в казарме пожарных, и к рассвету каждый из них получил дозу облучения, превышающую норму в 1000 раз. Их доставили в Москву военным самолетом, затем их лечили в специализированной клинике. Люся была беременна. Она поспешила в Москву, но вся информация об облученных, как обычно у нас, была строго засекречена. Конечно, это было секретом полишинеля. Первый милиционер, к которому она обратилась, объяснил ей, где находится данная клиника. И вот что ей сказали врачи: текст достоин Шекспира: *"Ты войдешь в палату и увидишь своего мужа. У него будет почти обычный его вид, но это другой человек. У него те же уши, те же глаза, волосы, но ты не должна подходить к нему. Ты не можешь его погладить. Ты не можешь его обнять. Ты можешь только на него смотреть. Это уже не живое существо, а радиоактивный объект, который нужно "обезвредить". У него лучевая болезнь... Он проживет только 2 недели".*

Я ее слушала и вскоре поняла, какую книгу я должна написать. Книгу для человечества, способного обнаружить те новые знания, которые мы извлекли бы из происшедшего события. Белорусы, как "черные ящики" самолета, записывали информацию для будущего. Информацию о страхах будущего.

Записи первых дней

Надежда Выговская, эвакуированная из города Припять: *"Это произошло в ночь с пятницы на субботу... Утром никто ничего не подозревал, но в воздухе определенно витал неприятный запах дыма. Я отправила своего сына в школу, а мой муж пошел к парикмахеру. Я принялась готовить завтрак, когда внезапно вернулся муж: "На станции начался пожар. Приказали оставить радио включенным".*

"Тогда мы жили в Припяти, недалеко от реактора. Ночью мы увидели необычайно красивое зрелище... До сегодняшнего дня у меня перед глазами стоит этот реактор, который казался светящимся изнутри. Все небо светилось. Это был необычный пожар, а очень насыщенный свет розово-малинового цвета. Я ничего подобного никогда не видела даже в кино. Я никогда не читала ни о чем похожем. Вечером люди выходили на свои балконы, а те, у кого их не было, шли к своим родственникам или друзьям. Мы жили на 9-м этаже. Мы видели потрясающую панораму. Люди выводили своих детей на балконы, поднимали их на руки. "Посмотри, как красиво! Запомни эту картину". Это были инженеры, техники и операторы, которые работали на станции. А также были преподаватели-физики. Все находились в черной пыли... Разговаривали... Вдыхали ее... Восхищались... Некоторые приезжали издалека, проделывали путь в десятки километров на машине или велосипеде, чтобы это увидеть. Мы не знали, что смерть может быть такой красивой".

Иван Жмыков, инженер-химик: *"Через 6 месяцев после происшествия я получил повестку из призывного пункта. За 2 дня нас одели в военную форму и отправили в зону. Мы ее называли "зоной Апокалипсиса", люди передавали из рук в руки экземпляр Библии. Все хотели ее прочитать, в поисках различных пророчеств, которые сравнивали с тем, что мы видели. Там мы делали простую и странную работу, которую в прошлом никто никогда не делал. Мы мыли дома, асфальтовые дороги, деревья, кусты... Мы зарывали землю в землю: мы снимали верхний слой зараженной земли, грузили его в вагонетки и перевозили все в специальных "гробах". Мы поднимали землю, сворачивали ее в большие рулоны, как ковер. Представьте зеленый газон с травой, цветами, корнями... жуками... бабочками... пауками... червями... зеленые, красивые, оранжевые. Их было тысячи. Миллионы. Я никогда не думал, никогда не понимал, что в жизни есть столько живых существ. Я не знал их названий, ни одного названия. И вот что мы делали: закапывали землю в землю... работа сумасшедших... после нам можно было увидеть лунный пейзаж. Очень белый песок, желтая, бесплодная земля, незнакомая красота, как на луне. Без следа человеческой жизни, даже время течет по-другому. Мы вошли в одну деревню, большую деревню, примерно в 300 домов, но после взрыва она была совершенно пуста, все жители были эвакуированы. Осталась только одна старая женщина. Она спряталась. Однако мы зашли в ее дом: "Сыночки, не трогайте меня!", — закричала она, схватив икону, — "Я не оставлю свою землю. Разве это война? Я пережила войну: убивают, бомбят, все горит, чужие солдаты захватывают деревню. Но здесь у меня фруктовый сад в цвету, поют птицы, в моем огороде появились ростки лука. Здесь живет маленькая мышка, здесь живут воробьи. И разве это война!"*

Никто из нас тогда не знал, что это была война. Другая война...

Анастасия Ивановна Кульчицкая, пенсионерка: *"Я вам расскажу две вещи. Однажды, когда солдаты были у нас, лось вошел во двор моего дома, совсем рядом с лесом. Животные часто приходят сюда: кабаны, зайцы, лисицы. Так как большинство жителей покинули деревню, они больше ничего не боятся. Один солдат увидел лося и схватил свое ружье, чтобы убить его, но мой муж и я остановили его, умоляя: "Подождите, не делайте этого! Господь с вами, не стреляйте! Животные — это как семья для нас. У нас одно и то же горе". А затем милиция нам приказывает мыть поленья. Не есть яйца наши кур, не пить молоко наших коров, не варить наш картофель. Кто мог себе это представить: даже то, что сварилось в печи, — не съедобно. Вечного закона нашей жизни больше нет. Нельзя даже пить нашу воду".*

Что же я ищу? Я ищу потрясенного человека... Того, который почувствовал себя одиноким, находясь перед вечностью, которая диктует новый текст.

Я поднимаю телефонную трубку, незнакомый голос мне говорит: *"Я слышала, что вы собираете информацию для книги о Чернобыле. Нам нужно встретиться. Но поторопитесь".* По телефону я узнала, что этот человек был пилотом вертолета. Он сбрасывал мешки с песком на реактор, который горел. Теперь он был очень серьезно болен. Несколько дней спустя мы встретились. Когда огромная тень в два метра мне открыла дверь, сказав: *"Я — ЭТО, покрытое кожей"*. Мне стало понятно, почему он просил поторопиться. *"Это хорошо, что вы пришли вовремя. Доктора говорят, что мне осталось жить один-два месяца. Я хотел бы рассказать кому-нибудь... Оставить мое свидетельство... Всего до конца. Мы не поняли, но мы многое увидели, это нужно записать, это нужно запомнить. Я не понял, что со мной происходило, может быть, вы тоже не поймете, но другие поймут... Позже... После нас..."*.

Вот письмо одной матери, которая совсем недавно потеряла свою 3-летнюю дочь. *"Я больше не боюсь смерти. Моя дочь лежала такой красивой в гробу, как куколка. И никто не заметил, что у нее не хватает 2-х пальцев на правой руке. Я плакала. Как она там будет, в раю? Ей же не хватает 2-х пальцев. И к тому же это девочка"*.

Встреча с двумя беженцами из Таджикистана и Армении в районе Наровли. Там война, там кровь. Им некуда больше идти. Их никто нигде не ждет. Великую Россию мало заботят маленькие люди... На данный момент 25 миллионов русских живут за пределами своих границ, в бывших советских республиках. Другая Россия. В зараженных районах Беларуси дома, оставленные своими жителями, и целые улицы снова заполняются людьми.

Сталкиваются 2 потока людей: коренные белорусы, покидающие зараженную зону, и беженцы, приехавшие из прилегающих стран бывшей советской империи, туда устремляются.

Одна семья, которая из-за страха репрессий предпочитает остаться анонимной: *"Здесь, в Беларуси, мы боимся меньше, чем там"*, — говорит девочка. — *Я боюсь человека с ружьем. Это самое ужасное, что может быть. Мы пережили жуткие вещи... Представьте себе... Люди, которые работали вместе, которые приглашали друг друга в гости, собирались вокруг одного стола. Затем одни пришли к другим с автоматами, крича: "Русские, убирайтесь отсюда! Возвращайтесь к себе в Россию! Вон!". Мы оказались без родины. Нашей родиной был Советский Союз, которого больше нет. И того времени больше нет. Нет и тех людей. Мы — не русские, мы — советские. Это наша национальность. Моя мать — русская, отец — украинец. Кто я?.. В Беларуси много земли. Люди ее оставляют, никто не хочет жить там. Нас не прогоняют отсюда"*.

Мать: *"Отныне наш дом здесь. Чернобыль — наш дом. Нас спрашивают, боимся ли мы, но мы не знаем того страха, о котором нам говорят, его нет в нашей памяти. Я знаю, что такое чума, холера, война. Но кто знает, что такое Чернобыль. Здесь, как и везде, растет трава и поют птицы. Есть памятник Ленину. И никто не стреляет"*.

Эта война нам всегда служила средством измерения ужаса на протяжении всей нашей истории. Но Чернобыль изменил все, даже наше отношение к страху, ко времени, к географии. Мне кажется, что мы утратили бессмертие, что мы утратили вечность.

Я пришла на открытие первого памятника жертвам Чернобыля. Он мне напомнил наши памятники погибшим. Мы уже живем в будущем, внутри будущего, в то время как наша культура, наши мысли, наши чувства — они в прошлом.

Как только отступает наше сознание, культура также отступает... Работает только подсознание... Я записала слухи, которые постоянно витают в воздухе: *"Умерших собирают в ближайших к атомному реактору деревнях, их перевозят автобусами или вагонетками на кладбище, и хоронят их тысячами в общих могилах. Как и во время блокады Ленинграда..." "В реках и озерах всплывают щуки без голов и плавников. Плавают одни лишь внутренности".*

"Животные в лесу страдают от лучевой болезни. Охотники их боятся и жалеют. Они не убивают их больше". Историй все больше и больше, и истории представляются мне, как истории человеческих страхов, как жизнь наших страхов...

Один старый пчеловод: *"В этот день... утром я пошел в сад. Он был уже в цвету, совершенно белый, но я почувствовал, что мне чего-то не хватает. Обычных звуков. Затем я понял, я больше не слышал жужжания пчел. Десятки пчелиных ульев под яблонями. Что же произошло? Я снял маску, чтобы удостовериться: в ульях пчелы были совершенно бесшумными. Они не вылетали, не жужжали. Они не вылетали на следующий день, ни через день... Я думал, что они заболели... Что они были отравлены минеральными удобрениями колхозных полей, химическими средствами... Мало того, позже, 2 недели спустя, нам сообщили, что на атомной электростанции, в 30-ти км от нашей деревни, произошла авария. Мы ничего не знали об этом. Пчелы, они все это узнали сразу же"*.

Одна доярка: *"В этот день... вечером пастухи пригнали стадо коров. Они были удивлены, они расспрашивали друг друга... В полдень, когда стадо подошло к реке, коровы не захотели пить воду. Пастухи их толкали, но они сразу же пятились назад. Никто ничего не понял. Много дней спустя нам сообщили по радио о взрыве в Чернобыле. Вода нашей Припяти была заражена..."*

Один мальчик: *"В этот день... Утром я проснулся. Я свистнул, чтобы позвать моего друга. Мы сели на велосипеды и поехали ловить рыбу. У въезда в деревню мы остановились, чтобы накопать червей. Мы знали одно место около старой конюшни, где их было много. Мы копали и копали. Но не нашли ни одного земляного червя. Они все ушли глубоко в землю. Возможно, на целый метр. Дома нам никто не поверил... Прошло много дней. Все заговорили о Чернобыле. А мой случай с червями был в день аварии... Вот загадка... Когда об этом я рассказал моему учителю биологии, даже он не смог ничего объяснить..."*

Я осматриваю все вокруг другими глазами... У кого место на земле более надежное, вечное — у человека или у них: у птиц, пчел, майских жуков, растений? Можно было бы научиться этому стремлению к выживанию. Нужно было бы научиться тому, что знают они, что они хранят в своей памяти, в своей культуре, в своей цивилизации.

Здесь, в зоне, разница между ними и мной сохраняется. Больше нет этой пропасти, которая нас разъединяла в прошлом.

Все — есть жизнь. Мы все являемся живым временем.

Когда ученые белорусской Академии наук обсуждали план эвакуации из зараженных районов, встал один вопрос: что же делать с животными? Человек все время думает о себе, пишет о себе. Но рядом с нами есть еще множество живых существ. Что же с ними делать? Как их защитить? Можно вывезти из зараженной зоны стадо коров, лошадей... Можно вывезти гусей, кур, уток. Но что делать с животными, которые живут в лесу и на болотах? Что делать с птицами в небе и насекомыми на земле?

И вот, человек покинул зону, оставив там животных. Позже их убили... Тогда возникает вопрос о нашей ответственности за мир природы. По какому праву мы приговариваем животных?

Иногда мне кажется, что мы любим бояться физически, мы подвластны смерти, которая становится нашим единственным будущим. Но это больше не старая женщина, держащая косу, это — красивая женщина, красота...

Мы все объединены страхом — сильные и слабые, богатые и бедные, счастливые и несчастные. И очевидно, что мы нигде не можем спрятаться... Никакая армия, никакая милиция не может нас защитить. Никакое расстояние, никакая ракета, никакой самолет, никакая торпеда не может нас защитить. Ничто и никто не придет к нам на помощь! Что значит "далеко" и "близко"? Что означает "свои" и "чужие"? После Чернобыля наша культура — это всего лишь сундук, наполненный старыми манускриптами...

Я встретила одного японского ученого в зараженной зоне и спросила его, что он здесь делает: *"Мне готовимся к будущему"*, — ответил он мне.

Я размышляла о художественном характере Зла, о Зле как о форме знания. Жизнь нам часто бросает вызов поверить в ее правдивость. Я вдруг почувствовала, насколько моя вера в документы была наивной. Документ, после всего, является лишь человеческой версией реальности. Это страсть. Человек ей полностью отдается: он помещает туда свои знания, свое поведение, свою веру, свои суеверия, короче, всю свою жизнь. Наша жизнь так мала и так несовершенна.

Искусство — это борьба против исчезновения следов Чернобыля, и нельзя привыкнуть к такое Чернобыль. Здесь, как и везде, растет трава и поют птицы. Есть памятник Ленину. И никто не стреляет".

мысли, что мы исчезнем, что мы проживем жизнь, не оставив следов. Мы все время стремимся к счастью! Мы стремимся к смыслу, к значению. Мир в трех измерениях все меньше соответствует современному человеку. Ему тесно. Человек пытается хоть на чуть-чуть проникнуть дальше... В бесконечность, немыслимую, непостижимую...

Как Чернобыль меня изменил! Он своими хищными и крепкими когтями навсегда вырвал меня из материализма. В конце концов, материализм — это борьба против бесконечности, против тайны.

На улице: *"Теперь я боюсь всего: я боюсь покупать творог или ягоды, или даже все равно что на рынке. Даже когда я покупаю творог в магазине, я спрашиваю себя, из какого молока он сделан, откуда он может быть привезен"*.

"К одному соседу пришли домой и забрали его, так как он — военный запаса, для того, чтобы он участвовал в работах по ликвидации последствий аварии. Люди боятся. Когда они получают повестки, они не приходят на призывные пункты. Тогда армия приходит за ними домой. Из выслеживают".

"Также пришли и за моим мужем, посреди ночи, чтобы отвезти его в зону. Постучали в дверь: "У вас 15 минут, чтобы собрать свои вещи!" Я счастливая, что у меня двое детей, мальчик и девочка. Потому что я не знаю, что может произойти, когда муж вернется... Говорят, что там..."

"Я больше не могу читать газеты. Слова, которые используют, — слова войны: эвакуация, атом, взрыв... Война всегда присутствует в моем сознании. Я была тогда маленькой девочкой, но я помню все, как будто это было вчера".

"Раньше самым ужасным была война. А теперь — это Чернобыль. Но радиация — это что? Кто ее видел? Какая она: белая, серая?"

"Мама позвала: нашу деревню эвакуируют. Прислали автобус, чтобы перевезти детей в первую очередь. Но председатель колхоза заставил погрузить свою мебель, ковры, мешки с картофелем, консервами. Даже если наступит конец света, человек всегда останется таким же грешником без веры..."

"Раньше опавшие листья собирали в парках и жгли, сейчас их закапывают..."

"Мой муж — водитель такси. Он возвращается с работы и принимает валидол. У него нарушился сердечный ритм. Он рассказал, что каждый день 3—4 птицы сталкиваются с его машиной на полном лету, они погибают. У них больше нет сил лететь ввысь. Они прячутся на балконах, как будто сошли с ума".

В родильном доме: *"Как только я рожу, покажите мне ребенка. Я хочу проверить его ручки и ножки. Мой муж работал на строительстве саркофага в Чернобыле..."*

"Вчера одна женщина родила девочку. У нее нет 2-х пальцев на обеих руках. И это хорошенькая молодая женщина".

"Как заниматься любовью? Я и мой муж, мы боимся... Мы — из Чернобыля..."

"Мы мечтаем иметь сына. Красивого и сильного мальчика. Я так люблю своего мужа! Я счастлива. Но мы не сможем иметь детей. Он приехал оттуда 10 лет назад. Только это ничего не меняет. Чернобыль тянется за нами..."

В театре: *"Партия требует, чтобы показали спектакль о Чернобыле. Что-нибудь героическое. Народную эпопею..."*

"Нужно избегать фантастики и попробовать понять, что происходит. Нам нужен документ. Когда реальность более невероятна, чем любая фантастика. Нужно иметь документ".

"Я никогда не поставлю спектакль о Чернобыле, также я никогда не ставила пьесы о войне. Зло слишком привлекательно..."

"Нам принесли пьесу. Коллекцию ужасов... Мы ее прочитали и вернули автору..."

Я ищу другое: нужно извлечь смысл из этого ужаса, попробовать описать неописуемое. Если получится, нам не останется ничего, как забыть.

О чем мой рассказ? О таинственном мире Зла. И о тайне человека.

Речь человеческая может превзойти художественную форму. Искусству недостаточно заставить слушать точные свидетельства человека... Тексты есть повсюду... Тексты... У каждого свой текст. Свой секрет. Нужно только слушать.

«Шасцёрка»: сіта ці люстэрка?

Распачынаецца праца над чарговай Нацыянальнай справаздачай аб чалавечым развіцці Беларусі. На гэты раз яна будзе мець назву: "Эканоміка і грамадства Беларусі: асіметрыі і перспектывы развіцця".

З гэтай нагоды ў офісе прадстаўніцтва ААН у нашай краіне адбыўся брыфінг для журналістаў. Адкрываючы яго, новы прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі спадарыня Джыхан Султаноглу акрэсліла дзве мэты Нацыянальнай справаздачы. Першая — правесці аналіз развіцця розных рэгіёнаў краіны да ўзроўню раёна, даследаваць дыспрапорцыі гендэрнага развіцця, доступу да паслуг аховы здароўя, дыферэнцыі развіцця горада і вёскі. Другая — выяўленне наступстваў для Беларусі ў выніку пашырэння Еўрапейскага Саюза. Было адзначана, што Еўропа набыла новы воблік. Перспектывы і магчымасці пашырэння Еўрапейскага Саюза вельмі важныя для Беларусі. Таму справаздача з выкладкай новых думак і рэкамендацый можа быць даволі карыснай для беларускага ўрада і грамадства.

Безумоўна, добра, што з'явіцца такі дакумент. Вось толькі ці зацікавіць ён беларускія ўлады, якія хінуцца ў зусім іншую эканамічную прастору, у тую, якая звязвае Расію, Украіну ды Казахстан.

Выклікае пытанні якасць будучай Нацыянальнай справаздачы. Было сказана, што ў абавязкі групы па яе падрыхтоўцы не ўваходзіць збор даных. Яны бяруцца з афіцыйнай статыстыкі. А тое, што наша статыстыка нярэдка малюе рэчаіснасць ружовым колерам, выказвалася ў СМІ не раз. Гэта праблема, праблема даставернасці даных, цікавіла і журналістаў у час брыфінгу. Але грунтоўных адказаў, на мой погляд, не прагучала.

У мяне выклікала пэўнае сумненне змена тактыкі падрыхтоўкі Нацыянальнай справаздачы. Склалася ўражанне, што незалежным экспертам цяпер будзе складана выказаць у справаздачы свае меркаванні. Раней яны падаваліся. Цяпер жа створаны шэсць груп, якія будуць папярэдне праводзіць экспертызу раздзелаў. Калі ўлічыць, што ў групы ўвойдуць даследчыкі дзяржаўных навучальных і навуковых устаноў, якія, не сакрэт, залежны ад улады, дык ці не стануць яны ўлічваць пажаданні ўлады пры падрыхтоўцы справаздачы? Ці не здарыцца так, што галасы незалежных экспертаў будуць гучаць толькі на пасяджэннях "шасцёрак", а да справаздачы не дойдуць праз такое сіта.

Вось, думаецца, праблемы, над якімі варта яшчэ сур'ёзна папрацаваць спецыялістам прадстаўніцтва ААН. Бо такі грунтоўны дакумент, як Нацыянальная справаздача аб чалавечым развіцці, павінен быць не ідэалагічным, а аб'ектыўным. Толькі пры такой умове ён можа прынесці карысць.

Алесь ДРАБЧУК.

У МАЗа праца ёсць. Да канца года

Вытворчасць аўтобусаў на Мінскім аўтазаводзе поўнасцю забяспечана заказамі да снежня 2004 года. Пры гэтым першапачаткова створаныя магутнасці па вытворчасці 500 аўтобусаў у год будуць перакрытыя на 20 працэнтаў. Па выніках года прадпрыемства выпусціць каля 600 аўтобусаў розных мадэляў.

Як паведамілі БелаПАН у цэнтры грамадскіх сувязей МАЗа, абсалютная большасць вырабляемых аўтобусаў будзе пастаўлена за межы Беларусі. Мінск за пяць месяцаў 2004 года заказаў 16 аўтобусаў і 8 тралейбусаў. Магчыма, што да канца года ў сталіцу Беларусі будзе адгружана яшчэ 25-27 аўтобусаў. Такім чынам, зазначаюць на МАЗе, агульная колькасць пастаўленых у Мінск аўтобусаў дасягне 40 штук, што зусім не адпавядае рэальным патрэбам горада.

Прычына такога становішча, на думку экспертаў, — у адсутнасці належнай сістэмы планавання расходаў са сродкаў транспартнага збору, што паступаюць у распараджэнне мясцовых бюджэтаў. Сродкі альбо наогул не плануюцца для закупкі сучасных айчынных аўтобусаў вялікай умяшчальнасці, альбо расходуюцца не па прызначэнні.

Аляксей АРЭШКА.

Сцяг, герб, гімн — дзяржаўныя сімвалы

Савет Рэспублікі ўхваліў праект закона "Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь", прыняты Палатай прадстаўнікоў 3 чэрвеня.

Прадстаўляючы законапраект, старшыня камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Наталля Андрэйчык паведаміла, што ён прадугледжвае сістэмнае рэгуляванне пытанняў дзяржаўных сімвалаў рэспублікі, якія прадугледжаны Канстытуцыяй, вызначае апісанне і парадак іх выкарыстання.

Законапраектам, паводле яе слоў, устанаўліваецца, што сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з'яўляюцца дзяржаўны сцяг, дзяржаўны гімн і дзяржаўны герб.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Да нас дакаціліся... бізнес-колы Аўстрыі

У Гомель прыбыла дэлегацыя дзелавых колаў Аўстрыі.

Аўстрыйскую дэлегацыю ўзначальвае начальнік упраўлення Усходняй Еўропы і СНД Палаты эканомікі Аўстрыі Гвіда Б. Шток. У яе склад увайшлі прадстаўнікі 24 вядучых аўстрыйскіх кампаній, у тым ліку "Voest-Alpine Krems" (вытворчасць спецыяльных фасонных труб і профіляў са сталі), "Siebtechnik GmbH" (вытворчасць цэнтрыфугаў, драбілак, сушылак, млынаў і г.д.), "Norbert Schaller GmbH" (вытворчасць мясаперапрацоўчага абсталявання), "NGR Next Generation Recyclingmaschinen GmbH" (вытворчасць абсталявання для перапрацоўкі адходаў з тэрмапластоў і тэхнічных палімераў), "Euroclima" (вытворчасць кандыцыянераў і вентыляцыйных сістэм), "Engel Austria GmbH" (вытворчасць тэрмапластаўтаматаў), "Baren Batterie GmbH" (вытворчасць аўтамабільных і прамысловых свінцова-кіслотных батарэй), "Dipl.-Ing. Stefan Landau" (распрацоўка праектаў і пастаўка сцэнічнага абсталявання).

Ірына САЗАНОВІЧ.

Будзем змагацца з нелегальнай міграцыяй

Беларусь мае патрэбу ў "большай падтрымцы — як практычнай, гэтак і метадалагічнай — у барацьбе з нелегальнай міграцыяй з боку Еўрапейскага Саюза". Пра гэта заявіў генеральны дырэктар Міжнароднага цэнтра па развіцці міграцыйнай палітыкі (МЦРМП) Ёнас Відгрэн на сустрэчы з журналістамі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі.

Ёнас Відгрэн прыбыў з трохдзённым візітам у Мінск. Візіт ажыццяўляецца ў рамках праекта, што фінансуецца Еўрапейскай камісіяй, па пытаннях нелегальнай міграцыі ў рэгіёне СНД. Паводле слоў дырэктара цэнтра, Беларусь можа адыграць "важную ролю" ў гэтым праекце, які "закліканы аб'яднаць намаганні ўсіх краін рэгіёну ў барацьбе з нелегальнай міграцыяй". Чыноўнік таксама зазначыў, што арганізацыя спадзяецца "ўцягнуць Беларусь у больш інтэнсіўны працэс узаемадзеяння" з МЦРМП. Цяпер, паведаміў ён, абмяркоўваецца магчымасць заключэння дагавора аб двухбаковым супрацоўніцтве.

На думку Ё.Відгрэна, пасля нядаўняга пашырэння Еўрасаюза неабходна "актывізаваць сваё супрацоўніцтва" ў барацьбе з нелегальнай міграцыяй з усімі сваімі ўсходнімі суседзямі, у тым ліку і Беларуссю. У ЕС, зазначыў ён, "разумеюць, што гэтая з'ява — агульная праблема для ўсіх, падтрымліваць бяспеку еўрапейскага рэгіёна неабходна агульнымі намаганнямі".

Вольга ЛАПІКАВА.

З ліпеня «Белтэлекам» дасць ветэранам Вялікай Айчыннай вайны магчымасць бясплатных міжгародных тэлефонных званкоў унутры краіны

Рэспубліканскае аб'яднанне "Белтэлекам" аб'явіла аб святочнай акцыі да 60-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў для ўсіх інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. На працягу сутак 3 ліпеня 2004 года ветэраны змогуць бясплатна павіншаваць па тэлефоне сваіх баявых сяброў у іншых гарадах Беларусі.

Як паведамілі БелаПАН у РА "Белтэлекам", бясплатныя міжгародныя тэлефонныя размовы па краіне будуць прадастаўляцца ў пунктах калектыўнага карыстання (ПКП), аўтаматызаваных перагаворных пунктах (АПП), аддзяленнях сувязі па прад'яўленні "Пасведчання ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны" ці "Пасведчання інваліда Вялікай Айчыннай вайны". Бясплатна патэлефанаваць можна будзе таксама з кватэрнага тэлефона, зарэгістраванага на інваліда ці ўдзельніка ВАВ, па аўтаматычнай сувязі ці праз тэлефаніста. Такая ж магчымасць будзе дадзена інвалідам і ўдзельнікам ВАВ, якія знаходзяцца на лячэнні ў шпіталях. Яны змогуць патэлефанаваць са шпіталяў з выдзеленага для гэтых мэт тэлефона, прад'явіўшы пасведчанні.

Пагаварыць па тэлефоне са сваімі баявымі сябрамі ў Беларусі змогуць і ветэраны-госці краіны — ім таксама будзе дадзена магчымасць бясплатных размоў з пунктаў калектыўнага карыстання, перагаворных пунктаў, аддзяленняў сувязі па прад'яўленні пасведчання інваліда ці ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

Разам з тым, падкрэслілі ў аб'яднанні "Белтэлекам", паранейшаму платнымі будуць у гэты дзень размовы з абанентамі мабільных сетак і выхад у Інтэрнет.

Ва ўсіх абласных гарадах для ветэранаў арганізавана праца даведачных службаў, дзе можна ўдакладніць пытанні па прад'яўленні бясплатных міжгародных тэлефонных размоў: у Мінску — 053, у Мінскай вобласці — 814, у Гомелі — 072, у Брэсце — 053, у Віцебску — 814, у Магілёве — 818, 053, у Гродне — 812.

Ірына САЗАНОВІЧ.

ХОТИТЕ ЗНАТЬ...

Продолжат ли немцы компенсационные выплаты?

В настоящее время бывшие узники лагеря Озаричи получают эти выплаты, согласно закону, принятому немецким парламентом. Этот закон закрепил договоренности, достигнутые восемью странами, в том числе и Беларусью, в ходе почти двухлетних переговоров.

Следует ли ожидать со стороны правительства Германии еще каких-либо программ по компенсационным выплатам? Как сказал первый секретарь посольства Германии в Республике Беларусь **Хольгер КРЕМЕР,** больше выплат ожидать не следует по причине того, что в ходе переговорного процесса все участники согласились с тем, что речь идет "об окончательном урегулировании всех этих вопросов". *"Но этого не следует ожидать,* — говорит

Народная Воля
18 ЧЭРВЕНЯ 2004 г.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

ТЕМА ДНЯ

Как готовили 11 сентября?



Комиссия, расследующая обстоятельства терактов 11 сентября, обнародовала два предварительных доклада, из которых явствует, что она не нашла достоверных доказательств причастности Ирака к этой трагедии и что первоначальный план "Аль-Кайеды" предусматривал угон не четырех, а 10 американских авиалайнеров.

Комиссия, созданная конгрессом в ноябре 2002 года и состоящая из десяти членов — по пять от каждой партии, должна обнародовать свой заключительный отчет в конце месяца, а пока периодически предает гласности свои предварительные доклады. Сейчас она выпустила 15-й и 16-й. Один содержит краткую историю "Аль-Кайеды", другой — историю подготовки сентябрьских терактов, задуманных еще в 1996 году одним из ближайших соратников Усамы бен Ладена — Халидом Шейхом Мохаммедом, который давно находится в плену у американцев. Доклад в большой степени основан на показаниях Мохаммеда и его сообщника Рамзи Бинальшибха, который помогал финансировать сентябрьские теракты, стоившие, по выкладкам комиссии, от 400 до 500 тысяч долларов.

"Аль-Кайеда" с ее годовым бюджетом в 30 миллионов долларов легко могла позволить себе такой расход.

Комиссия пришла к выводу, что если кто в регионе и сотрудничал с "Аль-Кайедой", то это скорее был Иран, нежели Ирак. Что до Ирака, то хотя бен Ладену был очень не по душе его светский режим, он рассматривал вопрос о сотрудничестве с Багдадом, когда жил в Судане в 1991—1996 годах.

Было время, когда он помогал базировавшимся в иракском Курдистане исламистам, боровшимся против Саддама, но суданские власти, дорожившие своими собственными связями с Багдадом, заставили бен Ладена прекратить эту поддержку и связали "Аль-Кайеду" с иракцами.

Высокопоставленный чин из иракской разведки три раза летал в Судан и наконец встретился с бен Ладеном в 1994 году. Тот попросил, чтобы ему выделили землю для учебных лагерей и помогли оружием, но ответа так и не получил.

Какие-то контакты имели место и после того, как бен Ладен вернулся в 1996 году в Афганистан, но, насколько можно понять, они не привели к сотрудничеству. "У нас нет достоверных доказательств того, что Ирак и "Аль-Кайеда" сотрудничали в подготовке атак против США", — резюмируют авторы доклада.

В другом докладе говорится, что, вопреки сообщениям чешской разведки, Мохаммед Атта, которого бен Ладен назначил "эмиром", то есть вожаком сентябрьских камикадзе, не встречался в Праге с сотрудником иракской спецслужбы.

Доклад с историей терактов 11 сентября содержит огромное количество доселе неизвестных подробностей. По первоначальному плану террористы должны были угнать 10 самолетов и обрушить их на знаковые объекты на обоих побережьях Америки — на Белый дом и вашингтонский Капитолий, на штаб-квартиры ЦРУ и ФБР, на высотные здания и атомные электростанции.

Один авиалайнер ожидала другая судьба. Его должен был захватить сам Мохаммед. Он собирался убить всех взрослых мужчин на его борту, посадить самолет, вызвать прессу, произнести гневную речь против политики США на Ближнем Востоке и потом отпустить женщин и детей. Бен Ладен забраковал эту идею.

Вождь "Аль-Кайеды" не раз настаивал, чтобы операцию провели раньше, чем планировали ее непосредственные организаторы. Например, он требовал провести ее в середине 2000 года, после того как Ариэль Шарон посетил мечеть в Иерусалиме и вызвал бурю протестов в исламском мире.

Потом бен Ладен настаивал на 12 мая 2001 года, когда исполнялось 7 месяцев со дня взрыва американского эсминца "Коул" на аденском рейде. Оба раза Мохаммед возражал, что операция еще не готова, и настоял на своем.

Би-Би-Си.

Массовое побоище в Колумбии

Боевики колумбийской левоэкстремистской группировки ФАРК убили 34 крестьянина в северо-восточной провинции Норте де Сантандер. Около 50 вооруженных автоматами боевиков ворвались в деревню Рио Чикита и открыли огонь, сообщил Би-Би-Си шеф местной полиции подполковник Вильям Монтесума.

Это — самый кровавый акт насилия в Колумбии с момента прихода к власти нынешнего президента Альваро Урибе. Бедные и безземельные крестьяне кормятся тем, что собирают листья коки и продают их как левым, так и правым экстремистам.

По сведениям полиции, жители Рио Чикита работали на правых — врагов ФАРК. Напуганные резней крестьяне массами бегут из опасной зоны.

Боевики появились на рассвете, когда люди, утомленные работой в поле, мирно спали в своих гамаках. Некоторых из них перед расстрелом связали веревками.

Лишь одной из жертв, 45-летнему Хесусу Байонне, удалось убежать и спрятаться в близлежащих холмах, несмотря на ранение в ногу.

Родные Мугабе «заражены СПИДом»

Выступая на первой национальной конференции по СПИДу в столице Зимбабве Хараре, президент страны Роберт Мугабе сделал сенсационное признание: вирусом заражены некоторые члены его собственной семьи. Сначала речь главы государства шла по обычному для таких мероприятий шаблону. Он назвал СПИД "одной из величайших угроз нации", отметил, что она не является непреодолимой, заверил, что улучшение доступа зимбабвийцев к квалифицированной медицинской помощи является приоритетом для правительства. И вдруг добавил: "В нашей стране трудно найти общину или семью, которую не затронул бы СПИД. Среди них и... семья самого президента".

Критики нынешнего режима давно упрекают его за недостаток внимания к проблеме СПИДа. Согласно даже официальной статистике, около четверти взрослого населения страны являются носителями вируса — один из самых высоких показателей в мире. В 2003 году число зарегистрированных случаев достигло 1,8 миллиона. Каждую неделю в Зимбабве умирают от СПИДа и связанных с ним осложнений около 3 тысяч человек.

В Пакистане автобус упал с моста, погибли 40 человек

Около столицы Пакистана Исламабада пассажирский автобус столкнулся с грузовиком и упал с моста, в результате чего погибли по крайней мере 40 человек и 10 ранены. В местной полиции уточнили, что ДТП произошло на мосту Каак приблизительно в 25 километрах от Исламабада. Автобус следовал в столицу. Дорожно-транспортные происшествия со смертельным исходом — не редкость в Пакистане, где водители зачастую пренебрегают требованиями правил дорожного движения.

Лучшим современным танком эксперты признали «Абрамс»

Американское агентство военных исследований опубликовало рейтинг основных боевых танков нескольких стран. Первое место в рейтинге занимает американский танк "Абрамс" — M1A2 SEP (производитель — корпорация General Dynamics) — последняя модификация основного боевого танка "Абрамс" образца 1978 года. Присуждая ему первое место, эксперты отметили, что он хорошо зарекомендовал себя во время боевых действий в Ираке.

Второе место досталось израильскому танку Merkava Mark IV производства Israel Ordnance Corps. Как в случае с "Абрамсом", на оценку "Меркавы" также повлияло применение его в антитеррористических операциях на Ближнем Востоке. Третье место занял японский "Type 90", который производит Mitsubishi Heavy Industries. Танк не участвовал в боевых действиях и поэтому о нем судили по результатам полигонных испытаний. Как отмечают эксперты, "Type 90", сделанный на основе немецкого "Леопарда", оснащен самым сложным электронным оборудованием из всех машин, участвующих в рейтинге.

Танки российского производства в рейтинге не упоминаются.

Родственники пассажиров сбитого Ту-154 отказываются от компенсаций Украины

Часть родственников погибших в авиакатастрофе российского самолета Ту-154, сбитого украинской ракетой в октябре 2001 года, намерены отказаться от получения компенсаций от Украины и требуют признания полной юридической ответственности за случившееся. Самолет Ту-154 авиакомпании "Сибирь", следовавший рейсом из Тель-Авива в Новосибирск, был сбит украинскими силами противовоздушной обороны 4 октября 2001 года над Черным морем. В результате катастрофы погибли 78 человек — все пассажиры и члены экипажа лайнера.

Своей вины в случившемся Украина не признала. Несмотря на это, после почти двухлетних переговоров Киев согласился выплатить по 200 тысяч долларов за каждого погибшего в катастрофе. Соответствующий закон был принят Госдумой РФ в середине мая этого года и затем одобрен Советом Федерации. 14 июня президент России Владимир Путин ратифицировал соответствующее соглашение с Украиной.

Французские энергетики отключили свет в президентском дворце

Французские энергетики отключили электроэнергию в официальной резиденции президента страны Жака Ширака в Париже в знак протеста против частичной приватизации энергетической отрасли. На 15 минут без света остались Елисейский дворец, расположенное неподалеку здание Министерства внутренних дел и Елисейские поля. Затем подача электроэнергии была возобновлена. Акция организована конфедерацией профсоюзов Франции CGT.

Представители конфедерации уточнили, что инцидент в президентской резиденции является частью плана по веерному отключению энергии на непродолжительное время. Таким образом энергетики пытаются заставить правительство отказаться от намерения преобразовать две государственные энергокомпании в акционерные общества.

Новым главой миссии ООН в Косово назначен датчанин

16 июня Генеральный секретарь ООН Кофи Аннан назначил датчанина Сорена Йессена-Петерсена новым руководителем гражданской миссии ООН в Косово. На этом посту Йессен-Петерсен сменил финского дипломата Гарри Холкери, который подал в отставку из-за проблем со здоровьем. В начале мая Холкери был госпитализирован в одну из больниц Франции с диагнозом "переутомление". Сорен Йессен-Петерсен стал пятым главой миссии с момента введения гражданской и военной миссии ООН в Косово в июне 1999 года. С февраля 2004 года Йессен-Петерсен занимал пост специального представителя Евросоюза в Македонии, а до того работал в управлении верховного комиссара ООН по делам беженцев и в секретариате ООН.

ЛЮБОПЫТНО

Фидель Кастро просил у президента США ... 10 долларов



Американское управление национальных архивов и записей обнаружило письмо, отправленное в 1940 году на имя тогдашнего президента США Франклина Рузвельта. Автор послания — 14 летний кубинский мальчик, будущий лидер страны Фидель Кастро. Написанное от руки письмо было обнаружено в архивах по чистой случайности. В нем Кастро просит Рузвельта исполнить одно его заветное желание: "Я никогда не видел десять долларов США и хотел бы получить одну из таких купюр", — пишет он. Письмо подписано: "Ваш друг". В качестве обратного адреса указана школа Colegio de Dolores в Сантьяго, где тогда обучался Кастро.

Поступающей президенту корреспонденцией занимается специальное управление Белого дома. Ответ Кастро был наверняка получен, но, скорее всего, желанной купюры там не было. Через 19 лет руководимые им партизанские отряды свергли режим президента Батисты, и Кастро стал новым лидером Кубы.

Наркокурьер проглотил 1,6 килограмма кокаина

Наркокурьер из Нигерии, пытавшийся провезти в Норвегию груз кокаина, проглотил 1,6 килограмма наркотика, чтобы скрыть его от таможенников. Для норвежской таможни это — абсолютный рекорд. Таможенники заявили, что, насколько им известно, в мировой практике ранее не фиксировались случаи проглатывания наркотика в подобных количествах. У врачей ушло три дня на то, чтобы вывести кокаин, расфасованный в 160 пакетиков, из организма наркокурьера. Если бы хотя один из пакетов порвался, перевозивший его курьер наверняка бы скончался. Таможенники заподозрили неладное во время собеседования с нигерийцем, просившим в Норвегии убежища. В ходе беседы курьер постоянно отказывался от еды и питья.

ПОСТСКРИПТУМ

Белорусы наблюдали за выборами в Европарламент

Делегация Европейской коалиции "Свободная Беларусь" приняла участие в наблюдении за выборами в Европейский парламент, которые прошли в объединенной Европе 13 июня. В рамках визита, проходившего на территории Земли Шлезвиг-Гольштейн, состоялись встречи с **Хейде СИМОНИС,** премьер-министром земли Шлезвиг-Гольштейн, Хейди Вичцорек-Цойл, федеральным министром по экономическому сотрудничеству и развитию, а также с **Габриэле КЕТШАУ,** вице-президентом парламента земли Шлезвиг-Гольштейн, по инициативе которой совместно с белорусским представительством Фонда Фридриха Эберта был организован этот визит.

Основная программа визита была построена вокруг избирательной кампании члена Социал-демократической партии Германии **Вилли ПИЧЕКА,** который избирался в Европарламент от Земли Шлезвиг-Гольштейн. После встречи с кандидатом белорусская делегация ознакомилась с методами и средствами проведения избирательной кампании в Германии, провела беседы с работниками избирательного штаба и активистами СДПГ, непосредственно проводившими кампанию за Вилли Пичека. В результате кампании после подведения итогов выборов господин Пичек был повторно избран депутатом Европейского парламента. В связи с этим члены делегации передали ему свои поздравления.

Многочисленные встречи членов делегации прошли также в одном из крупнейших учебных заведений Германии — Университете города Киля, а также в институтах этого города. На встречах обсуждались вопросы расширения Европейского Союза и перспективы Беларуси в этом направлении, подчеркивалась важность контактов между Беларусью и Германией на уровне гражданского общества. Делегация "Свободной Беларуси" также встретилась с представителями Юных европейских федералистов — организацией, которая занимается пропагандой европейских ценностей среди молодого поколения жителей единой Европы. В один из дней делегация посетила соседнюю Данию, где проходили Дни немецкого меньшинства в этой стране.

В воскресенье, 13 июня, делегация "Свободной Беларуси" посетила несколько избирательных участков, а также присутствовала при подсчете голосов в одном из них. В 18 часов вечера, сразу после окончания голосования, урна с бюллетенями была вскрыта в присутствии белорусов, которые первые узнали о результатах выборов на данном участке. Члены делегации единодушно отметили конкурентный характер агитации, безусловную демократичность выборов, полную прозрачность системы подсчета голосов.

Как известно, в 2004 году на 732 депутатских места в Европарламенте претендовали 14 тысяч 670 кандидатов. В избирательные списки были внесены свыше 338 миллионов европейцев, имеющих право голоса.

Михаил СВЕТЛОВ.

ДА 80-ГОДДЗЯ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Леанід ШЧАМЯЛЁЎ

Непрыгладжаны, непаўторны

Васіль Быкаў і Леанід Шчамялёў.

Фота Яўгена КОКТЫША.

Спякотным летнім днём 1974 года я з жонкай прыехаў у Гродна, каб сустрэцца з пісьменнікам Васілём Быкавым. Звязана гэта было з задумай напісаць трайны партрэт сучасніка — "служыцеляў муз", ужо добра вядомых не толькі ў Беларусі. Для яго я выбраў мастака Міхаіла Савіцкага, кампазітара Ігара Лучанка і празаіка Васіля Быкава. І вырашыў пачынаць з Быкава. Ён мне чамусьці здаваўся "галоўнай" асобай, і верылася, што блізкае знаёмства з ім дапаможа знайсці "ключык" для карціны.

І вось у цеснаваты нумар гатэлю пастукаўся спакойны, сярэдняга росту, з трошкі насцярожаным позіркам, праставалосы Васіль Уладзіміравіч. Ягоная годная, някідкая сялянская пастава не зусім супала з маім ўяўленнем аб аўтары любімых, надзіва дакладных па дэталях ваеннага побыту кніг. Аказаўся ён вельмі "звычайным" і беларускім, без прыкмет сваёй значнасці і вядомасці. Можа, таму першыя хвіліны нашага знаёмства былі залішне афіцыйнымі і стрыманымі. Але паступова "дыстанцыя" паміж намі пачынала скарачацца — і таму, што ў нас была агульная франтавая маладосць, і таму, што мы былі землякамі (ён — ушацкі, я — віцебскі), і таму, што мы былі цікавыя адзін аднаму сваёй творчасцю.

Я адразу ж узяўся за працу, стараючыся зафіксаваць першае візуальнае ўражанне, бо яно, як кажуць, часта бывае самым дакладным. Найбольш мне хацелася "схапіць" ягоныя спакойныя засяроджаныя вочы і неахайна насунутыя на лоб пасмы мяккіх русых валасоў. Не прымушаючы Васіля Уладзіміравіча, які, дарэчы, выглядаў значна маладзейшым за свой узрост, сядзець нерухома, у адной позе, даючы яму магчымасць вольна рэагаваць на нашу гутарку, я патроху выпытваў факты ягонай біяграфіі.

Аказалася, што нашы баявыя дарогі за ўсю Вялікую Айчынную вайну так і не сышліся нідзе, бо я ваяваў на Беларускіх франтах, а ён — на Украінскіх. Аднак ён уразіў мяне выдатным веданнем усёй панарамы ваенных дзеянняў. Ён дакладна называў, якія арміі былі злева, якія — справа пры правядзенні тых ці іншых аперацый, у якіх удзельнічала і мая дывізія. Ён пералічваў мне нямецкія часці, якія супрацьстаялі нам у час баёў. А асабліва мяне ўзрушыла, як добра ён памятаў сваіх падначаленых, як цёпла расказваў пра іх, часцей за ўсё намнога старэйшых за яго гадамі. На фронце мы былі з ім прыкладна ў адным званні, на аднолькавых камандзірскіх пасадах (ён — у артылерыі, я — у кавалерыі), але я не ведаў і не памятаў пра сваіх пабраціміаў столькі, як ён. Гэта яшчэ больш напоўніла мяне павагай да яго. Хаця, калі ўсур'ёз задумацца, іначай і быць не магло, бо як бы ён тады змог быць такім граніч-на праўдзівым у сваіх выдатных аповесцях?..

Гаварылі мы і пра родную нашу Віцебшчыну, пра гэты прыгожы і бязлітасна пакалечаны войнамі і галечай край. І зноў я здзіўляўся, як шмат ён ведаў, як часта спасылаўся не толькі на ўражанні свайго дзяцінства, але і на гістарычныя дакументы, на аповеды землякоў, на кнігі класікаў. Ён быў глыбока і ўсебакова дасведчаным чалавекам, для якога лёс Радзімы важны і цікавы ў самых разнастайных падрабязнасцях...

Развіталіся мы яшчэ не сябрамі, але ўжо людзьмі, што знайшлі адзін у адным шмат агульнага і блізкага.

Назаўтра Васіль прыйшоў недзе каля абеда і... расчараваў мяне. Я ажно ўстрывожыўся. Быў ён акуратна падстрыжаны і, можа, таму нейкі прыгладжаны, кажучы па-пісьменніцку, як бы адрэдагаваны. Для мяне як мастака гэта ўскладняла справу — знікала нешта з той непаўторнасці ў знешнім абліччы, якую, як мне задавалася, я ў яго падгледзеў. Праца ў мяне не надта клеілася — я ніяк не мог злавіць у ягоным твары, ягоным настроі новае, не заўважанае напярэдадні. Скончылася ўсё тым, што мы вырашылі паабедаць у рэстаране гатэля. Спусціліся ўніз, занялі ўтульны столік, заказалі бутэльку армянскага каньяку і такую-сякую закусь. І тут Быкаў нібы скінуў з сябе халаднаватую "прыгладжанасць", і на лоб зноў вярнуліся непаслухмяныя пасмы русых валасоў...

Я ўжо ведаў, што не заўсёды выдатны пісьменнік бывае і бліскучым расказчыкам. Часцей — наадварот. Але ў тым застоллі я адкрыў унікальнага расказчыка Васіля Быкава. Ён зачараваў нас з жонкаю сваімі поўнымі гумару і дабрыні аповедамі і пра франтавыя прыгоды, і пра пісьменніцкія ўзасмаадносіны, і пра сваіх гродзенскіх сяброў. А яшчэ я даведаўся пра ягоныя сімпатыі да жывапісу. Ён аддаваў іх рэалістычнаму мастацтву, высока цаніў уменне адчуваць прыроду, улоўліваць дыханне зямлі. З горыччу і нават раздражненнем гаварыў, як запаланіла мастацтва бяскрылая, нахабная кан'юнктура, як халуйскае слугаванне ўладзе губіць талент. Пры гэтым спасылаўся і на вопыт літаратуры так званага сацыялістычнага рэалізму. Вельмі шчыра хваліў маладых мастакоў за іхнюю ўвагу да нацыянальнай гісторыі, за пошукі новых выяўленчых сродкаў, за творчую смеласць...

Час бег хутка, развітвацца не хацелася, але на вуліцы ўжо сутоньваўся вечар. Калі мы ўсё ж разышліся, я з усёй шчырасцю і несумненнасцю ўсвядоміў, які глыбокі, таленавіты і непаўторны чалавек і творца Васіль Быкаў...

...Карціна "Працаўнікі муз" экспанавалася ў Мінску, Маскве, а пасля і на Сусветнай выстаўцы ў Манрэалі. У сотнях рэпрадукцый разышлася яна па часопісах і альбомах, атрымала ўхвальныя водгукі прафесійных крытыкаў і аматараў мастацтва, стала для мяне "знакавай"...

Васіль Быкаў пасля той нашай сустрэчы напісаў яшчэ шмат выдатных твораў, якія я чытаў з асаблівай увагай і захапленнем. І атрымаў нямала самых высокіх заслужаных узнагарод. І стаў гонарам і сумленнем нацыі. І пасівеў. І журбой прытуманіліся ягоныя мудрыя вочы... А я ўсё ўспамінаю таго, гродзенскага Васіля, трохі насцярожанага, сціплага, непрыгладжанага і непаўторнага...

Мінск.

Данута БІЧЭЛЬ

Настаўнік і сябра

Напрадвесні 1996 года я апошні раз бачыла Васіля Быкава. Адзіны раз была ў ягонай кватэры ў Мінску. Па маёй просьбе ён пазбіраў крыху чарнавічкоў для экспазіцыі ў музей М.Багдановіча ў Гродне, дзе былі два пакоі ў драўляным дамку, у якіх мы дзве шафы "аддалі" Васілю Быкаву... Сын ягоны Васіль Васільевіч таксама падзяліўся сваімі скарбамі і нават "адарваў ад сэрца" карціну Плужніка "Вясна на Нёмане" і акварэльку Пушкова "Пастушкі" (з гэтымі мастакамі Быкаў сябраваў, найбольш з Плужнікам)...

Тады ў Мінску ён свае чарнавікі ўпрыгожыў тым, што панакрэсліў каляровымі фламастэрамі, выбраў фотаздымкі мінскага перыяду і падпісаў шасцітомнік. Найболей я ганарылася паштоўкай, якую Васіль сам стварыў: наклеіў на шчыльную паперу свечку, нейкую галінку...

Тады, у Мінску, мы паразмаўлялі за гарбатай пра ўсё — шчыра, паважна, як у далёкія гады маладосці. Прыгадалася, як прыемна размаўляць з філосафамі, яны апавядаюць пра падзеі, у якіх удзельнічалі галоўнымі героямі, так, нібыта іх там зусім не было. Цешылася я, што Васіль застаўся такім, якім ведала яго ў Гродне. Мне гэта было вельмі патрэбна.

Праз год на пачатку лета ехаў ён з Еўропы праз Гродна і зайшоў у музей Максіма Багдановіча. Размаўляў з А.Чаботам. Я сядзіла ў Мінск у той дзень... Падумалася тады, што нават добра, што мы размінуліся, бо мы ж даўно ўжо размінуліся.

3 снежня 2002 года Васіль Быкаў пазваніў мне — не ведаю, з якога месца. Павіншаваў з днём нараджэння. Пасля я слухала яго голас па Радыё Свабода... А сню яго — таго, даўняга гродзенскага...

27 ліпеня мінулага года ў Гродзенскай фары адбылася святая імша па Васілю Быкаву. Чаму так позна? У касцёльным журнале ўсе папярэднія нядзелі былі запоўнены. На імшы было шмат прыхільнікаў Быкава. Увечары мне пазванілі з той забытай мною, але спраўна працуючай магутнай "канторы". У мяне нават хапіла цярпення быць фармальна ветлівай...

Бачыце, мілыя, вы ўспамінаеце Быкава з болем ад расстання з ім. А я яго ўспамінаю з далёкага мінулага. Калі ў канцы 1977 года ён пакінуў Гродна, я выкрасліла гэтага мілага чалавека са свайго сэрца. Ён мусіў застацца толькі пісьменнікам, кнігі якога я чытала, выбіраючы для гэтага вольны час, каб не крыўдзіць дзяцей, каб дома быў запас простай ежы, — яго аповесці трэба ўвабраць у сябе і неяк выйсці з гэтага жывой...

Быкаў паехаў з Гродна на Усход, адкуль прыехаў, а логіка падказвала, што з Гродна трэба выязджаць на Захад.

Выезд Быкава я перажыла, як нервовае заламанне. Увесь час чакала, што нехта лупане мяне чаргой з-за вугла або ў спіну. Лупілі словамі. Але не гэта было найгоршае, а тое, што трэба было жыць далей без Быкава, у пустым горадзе.

І страшна было сустракацца з Надзеяй Андрэеўнай, першай жонкай Быкава. Але трэба было. Аляксей Карпюк сказаў: "Не пакідайма яе, бо як пры ёй не будзе нас, то будуць чужыя. А мы ж як сям'я". І званіла мне Ніна Іосіфаўна Кіркевіч, сяброўка і равесніца Надзеі Андрэеўны, прасіла, каб я пагуляла з імі ўвечары, каб ім не быць адным. Мы шмат вечароў хадзілі па нашых ціхіх завулках, яны апавядалі пра малодасць. Як у Надзею былі закаханы Кіркевіч і Быкаў. Кіркевіч як старэйшы адступіў у цень, пакінуў яе Быкаву... Такая яна была хатняя, цёплая, ніколі не сказала аб ім дрэннага слова. Казала, што вінаватая сама, што ён яе пакінуў. Пасля захварэла. У іх кватэры ў доме, які называлі "ластаўчына гняздо", бо ён стаіць на высокім месцы, я была за некалькі дзён да смерці Надзеі...

Няма ўжо і Ніны Кіркевіч, спачывае каля мужа, беларускага краязнаўцы. Усё неяк улягло-ся. А што памятаецца, не ўсё хочацца аддаваць на "продаж", шмат што лепей пакінуць для душы...

Пісьменнікам надта трэба размаўляць з пісьменнікамі. Прафесія слова вымагае. У Гродне ў гады маёй маладосці пісьменнікаў было мала. А Васіль Быкаў надта хораша ўмеў размаўляць. Быў варты цэлых кампаній, усіх творчых саюзаў, клубаў, цэнтраў, замяняў сходы, кангрэсы, дажынкі, фэсты, дні і тыдні літаратураў, якія тады праводзілі. У тых штучных тлумных святах з выпіванкамі хацелася крыху паўдзельнічаць, таму што там можна было сустрэць Быкава, паслухаць яго хоць здалёку — ён быў заўсёды ў цэнтры, ён быў захоплены іншымі, вакол яго быў натоўп. Нейкая прыцягальная харызма была ў ім. Вочы яго глядзелі з дабрынёй, спакоем, па-людску, уважліва, яны былі жывымі, з іх свяцілася душа. Аж дзіўна, што ён аднойчы сказаў пра Валодзю Караткевіча, што прырода надзяліла таго беларускімі вачамі і валасамі. У Валодзі былі вочы розныя — адно карае, а другое — шэрае. Тое самае Марыя Путрамант напісала ў польскім эсэ пра Быкава, што ў яго былі беларускія вочы і валасы. І гэта праўда...

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ДА 80-ГОДДЗЯ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Данута БІЧЭЛЬ

Настаўнік і сябра

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Найлепей было размаўляць з Васілём, сустрэўшы яго на вуліцы, калі ён нікуды не спяшаўся. Такіх вулічак з ціхімі дворыкамі тады ў Гродне было шмат, цяпер яны неяк ператварыліся ў прахадныя скразнякі.

Мог Быкаў вылепіць з мяне нешта цікавае ў творчым плане, меў на мяне моцны ўплыў. Не меў патрэбы, не накіраваў мой творчы пошук, толькі назіраў збоку. І ўсё ж дапамог мне. Напачатку падтрымаў у тым, што адпавядала майму характару: паэтцы трэба сядзець ціха ў куточку за сталом і пісаць...

Не ўмела я, хутаранка, даражыць прыхільнікамі майго таленту, не берагла сваіх чытачак — Васіль напрарочыў, што пры жыцці не будзе ў мяне як паэткі прызнання. Змірылася з гэтым, што пазбавіла мяне амбіцый. Адступала ўсё жыццё ў цень, уступала іншым. І з рэжымам я не змагалася, а рабіла выгляд, што яго не заўважаю.

Васіль назваў неяк мяне свойскім хлопцам, "клікуха" адпавядае маёй бабскай няўдаласці. Я не ўмела глядзець на мужчын так, як умеюць гарадскія паненкі. Гаворка вачамі — гэта не мой талент.

Ён мяне, як свойскага хлопца, браў у паездкі ў калгасы, дзе быў дэпутатам раённага ці абласнога Савета. Запрашаў у Друскенікі, дзе лячыўся Алесь Адамовіч. Казаў: "Карпюк не п'е, а ты свойскі хлопец". Я іх ціха слухала. Калі пачыналі раскручваць свае сюжэты-страшылкі, я нічога не магла там сказаць. За сталом у якім-небудзь рэстаранчыку яны гаварылі пра камуністычную карычневую чуму, якая страшней фашыстоўскай.

Ездзілі мы ў Друскенікі, калі там лячыўся Рытор Бярозкін, гэты выдатны майстар вуснага жанру. І ў Геніюшаў у Зэльве размаўлялі Васіль з Янкам Геніюшам, Ларыса Антонаўна зрэдку ўкліньвалася ў іх дыялог, калі трэба было адкарэкціраваць погляды Янкі. На юбілей паэткі, куды з'язджалася ўся інтэлігенцыя (ці апазіцыя) не толькі з Беларусі, але і з Украіны, Літвы, Васіль не ездзіў, але купіў куфэрак за свае грошы і заказаў гравіроўку. А ўсе гродзенскія аўтары паклалі ў куфэрак свае танюткія кніжкі.

На Дні літаратуры на Гродзеншчыне я вырывалася двойчы. А так далучалася да іх, калі з'язджаліся ў Гродна. Саромна і сумна ўспамінаю адзін вечар у рэстаране "Беласток", калі я там была новым чалавекам, а госці за тыдзень адзін аднаму надакучылі. Падымалі тосты за Дануту, чым крыўдзілі прысутную Еўдакію Лось, аж Быкаў, які сядзеў каля мяне, сказаў: "Сёння ўсе ўшацкія хлопцы п'юць за Дануту". Еўдакія пайшла з тас гасціны раней. І мне сорамна перад ёю ўсё жыццё...

Скульптар Аляксандр Ліпень, які таксама прайшоў усю вайну і дэмабілізаваўся і прыехаў з цэнтральнай Беларусі ў Гродна недзе ў 1956 годзе, успамінае, як ён упершыню ўбачыў Васіля Быкава. Ліпень жыў на вуліцы Леніна. За яго домам быў агарод, які злучаўся плотам з агародам дома з вуліцы Чапаева. На той вуліцы меў кватэру (прыватна) Васіль Быкаў. Ліпень маляваў з натуры вяргіні. Быкаў праз плот назіраў. Калі сустрэліся вачыма, Быкаў спытаў: "Я вам не перашкаджаю? Вы мастак?" Ліпень працаваў у гарачым цэху на ТЭЦ-1, мастацтвам займаўся як аматар. І сказаў: "Я скульптар, а малюю так, для душы". — "А ці можна паглядзець вашы скульптуры?" ...Скульптуры былі ў драўлянай пуньцы тут жа, у агародзе. Быкаў агледзеў іх і здзівіўся: "А навошта вы Леніна лепіце?" — "А без Леніна на выставу не бяруць"... Яны тады так і не пазнаёміліся. Але праз нейкі час спаткаліся ў кабінеце чыноўніка ад культуры, які сказаў Ліпеню: "Знаёмцеся, гэта Васіль Быкаў, карэспандэнт "Гродзенскай праўды"...

Калі Васіль памёр, у тралейбусе мяне зачапіла адна лекарка, тэрапеўт. Кажа: "Я была яго лечашчым урачом". Кажу: "Раскажыце, як вы яго лячылі?" Яна: "А ён не прыходзіў у паліклініку зусім, мы запрашэнні яму пасылалі, каб прыйшоў на праверку, а ён не прыходзіў..."

Астму Васіль лячыў у славутага народнага лекара, які рабіў спецыяльную мяшанку з зёлак і шмат чаго яшчэ. Здаецца, Малочка (або Талочка) яго прозвішча...

Я не памятаю дакладна, як першы раз убачыла Васіля Быкава. Са мной ён размаўляў толькі на беларускай мове, вусная мова яго была такой жа добрай, як пісьмовая. Гэта няпраўда, што ў яго не было свайго стылю. Але ацэньваць прозу Быкава з боку стылю не мае сэнсу — пад высакавольтнай напругай яго сюжэту не заўважаецца стыль мовы.

Калі пачынаюць казаць, што Быкаў не ўмеў выступаць перад слухачамі, то маюць на ўвазе той факт, што Быкаў не спускаўся да ролі блазна, чаго часта чакае дрэнная публіка ад беларускіх пісьменнікаў, як пісьменнікаў народа-парабка. Быкаў успрымаў людзей паважна і да сябе патрабаваў павагі...

Запрасіла неяк Васіля ў школу рабочай моладзі, дзе я выкладала мову і літаратуру. Ён прыйшоў. Вучні прачыталі аповесць і паспрабавалі выказаць свае думкі так, як бачылі падобнае ў тэлевізіі... Хваляваліся. Прыбег завуч на кантроль. Быкаў па дарозе ў школу зайшоў за зубнога і вырваў зуб. Калі заморозка пачала адыходзіць, ён крывіўся, бо балела. А завуч вырашыў, што Быкаву не падабалася, што вучні "вучаць" яго, як трэба пісаць. Атрымала ад завуча вымову...

Быкаў добра ведаў гісторыю Гродна, але не хваліўся гэтым. У вершы я зачапіла імя свайго святога-апекуна, пра якога я толькі ведала, што фрэскі ў Фарным касцёле паказваюць дзейнасць гэтага святога, а яго скульптура ў алтары ў цэнтры. Васіль ведаў значна болей: што ён з Іспаніі, што паехаў у Індыю, што там пахаваны. Так, мімаволі, ён расказаў пра гэта. Гэтак жа ён здзівіў мяне, калі ў размове нехта з прыезджых запытаў пра Стэфана Баторыя.

Са студэнцкіх гадоў мы хадзілі на пасяджэнні літаратурнага аб'яднання пры газеце "Гродзенская праўда", пакуль іх праводзіў Быкаў. Гэта адбывалася на другім паверсе дома, дзе цяпер знаходзіцца кантора друкарні. А пакой Быкава быў справа ў кутку, там сядзела некалькі супрацоўнікаў.

Літаб'яднанне як грамадскую нагрузку ён веў, каб усё было больш-менш прыстойна. Ахвотнікі пакрытыкаваць былі, дазваляў крыкунам выкрычацца. Сам выступаў у канцы, нібы нічога асаблівага не казаў, а казаў усё, што трэба было. Яго агляды, знешне фармальныя, мелі праграмнае ўздзеянне на ўсю далейшую творчасць. І літтаронкі, укладзеныя ім, у тых умовах — гэта была рэгіянальная літаратура. Але за аўтараў ён нічога не "дацягваў", не правіў.

Аднойчы пахваліў мяне. Кажа: "Ты склала гэту паэмку, як назбірала сунічак, высыпала іх у вядзерка, атрымалася поўнае з вяршком".

Я часта ў Быкавых у кватэрах не бывала, паважала іх прыватнасць. На вуліцу Алега Кашавога, якая цяпер Вялікая Траецкая, д.28, кв.20 зайшла я з Ларысай Антонаўнай Геніюш, калі яе не пускалі ў Беласток па тэлеграме лекараў пасля аперацыі сына Юркі. Не дала рады яе супакоіць, а Васіль супакоіў, загаварыў, напаіў гарбатай. Правёў нас да вуліцы Савецкай і пацалаваў яе на развітанне.

У лепшую, чатырохпакаёвую кватэру я заходзіла разы са два. Памятаю быў у Гродна Валодзя Кудзінаў і запрасіў мяне схадзіць з ім да Быкава.

Быкаў нас чакаў. Бегаў на кухню, выносіў надта смачныя бутэрброды з вяндлінкай, а пасля стаміўся і кажа: "У вас, рабяты, надта добры апетыт". Потым нечакана запрасіў нас пакатацца па Нёману. У Гродне была "лодкавая ліхаманка". Быкаў меў сваю маторку. Кудзінаву трэба было вяртацца ў Мінск. Быкаў пазваніў Валянціну Чэкіну, свайму "аружаносцу". Пракашў ён тады мяне аж да Мяловых гор — цяпер іх усе выкапалі! — напаіў там кавай з дымком...

Увесь час я спрабавала напісаць верш пра лодку Быкава. У 1996 годзе па дарозе ў музей (а гэта 10 мінут пешкі) у мяне гэты верш вырас:

Там лёд расстрэльвае вясна,
Чакаем добрую паводку.
Ужо Васіль малюе лодку.
Прыбег на Нёман давідна.
Ён выдаў кнігу не адну.
Адзін, як Нёман, задумлёны.
Над імі каркаюць вароны,
Чытае свет яго вайну.
А тут не свет — а блізкі Свет.
Усіх бы тут пазамяталі.
Тут не ў пашане божы талент.
Людзей не любіць самаед.

Верш я напісала, можна сказаць, прарочы, але лепей бы ўсё было іначай, лепей бы Васіль Быкаў не ездзіў па далёкіх еўрапейскіх месцах, а жыў дома, быў у цяпле, у шчасці...

Пасля размовы з Быкавым тады ў 70-я гады я напісала вершы, якія былі працягам нашых размоваў. Гэта былі найлепшыя мае гады. Але я не ведала аб гэтым. На аднатомніку Васіль напісаў такі аўтограф: "Няхай табе, Данута, будзе добра і шчасліва". Мне ў той час было добра і шчасліва, нягледзячы на нацыянальны прыгнёт, на здзекі з мяне, паэткі і настаўніцы беларускай мовы, на спецыяльныя праверкі маіх урокаў, нягледзячы на скандалы свекрыві... Шчасце мае дваістае дно, як цёзка маёй хатняй рэчкі, — латгальская Гаўя.

Жанчын-паэтак крыўдзяць, успрымаючы нярэдка іх эмацыйнасць, як сексуальную заклапочанасць. А ім трэба, каб іх выслухалі, пачулі і зразумелі, каб паважна ўспрымалі. Таму Васіль Быкаў у маім правінцыйным жыцці быў падарункам неба. Гледзячы збоку, і Быкаву ў Гродне было даволі камфортна. Ён здолеў так укласці быт, каб быў час на пісанне. Але горшага часу, як той, мусіць, для пісьменніка і прыдумаць нельга.

Пісьменніцкая праца не лічылася працай. "Где работаете?" — пытаўся мент, калі ты пераходзіў вуліцу на чырвоны святлафор. "Я пісьменнік". — "А, так вы и нигде не работаете..."

Праца ў газеце была яшчэ горшай, нават цяпер журналісты сядзяць у кабінетах у рабочы час, калі ў свеце яны бегаюць, ездзяць, лётаюць, шукаюць тэмы.

Быкава выбіралі ў Саветы, хоць ён ніколі не сядзеў на сесіях і быў непартыйны. У яго былі паважаныя людзі сярод франтавікоў, асабліва тыя, хто пісаў праўдзівыя ўспаміны. Але найболей франтавікоў было такіх, якія Быкава ненавідзелі. Быкаў пісаў пра вайну, у якой удзельнічаў на першай лініі фронту. Пісаў, як дрэнна на вайне тым, хто забівае і каго забіваюць. Як гадка праяўляецца на вайне тое дрэннае, што закладзена ў чалавечай прыродзе. Але некаторым на вайне было добра, яны вайну выкарысталі для дабрабыту і кар'еры.

Быкаў сам выбраў Гродна, горад, які ўбачыў да вайны мімалётам, які хоць звонку быў еўрапейскім — два замкі, святыні, пліты брукоўкі з надпісам "магістрат Гродна", ціхія вулкі, глухія дворыкі. Цяпер яны сталі скразняковымі. Толькі ў першыя гады ён здымаў прыватна кватэры не ў цэнтры. А пасля жыў і працаваў у старым горадзе, што вельмі важна для творцы.

Мне нядаўна расказала адна сяброўка, што яна купіла лекі ў Піцеры па рацэпту з Гродна. Аптэкар прачытаў і ўголас выказаўся: "Гродно... Это в каком же захолустье!" А яна яму кажа: "А гэта там, куды барока не спазнілася..." Дык вось, барока прыцягнула Быкава. Ён на вайне пабыў у Еўропе і ведаў, як там жывуць гараджане. Не хацеў ён вяртацца ні ў галодны калгас, ні ў разбураны Віцебск. Быкаву хацелася спакойна заняцца пісьменніцкай працай, хоць, магчыма, ён пра гэта думаў толькі падсвядома.

Але і хеўра савецкіх вайскоўцаў са сваімі галоднымі кланамі таксама выбрала Гродна. І вяскаўня "самаедаў" палезла ў горад на пасады і кватэры. Мясцовыя палякі і габрэі, каго не выбілі і не вывезлі, схаваліся хто куды, перапісаліся пашіху на рускіх. Тут вайна не скончылася, набыла іншую форму, з застарэлай прагай ахвярнай крыві. Быкаў ім падыходзіў на ахвяру. Але ён быў салдатам і ўступіў з імі ў бой да канца — і перамогай былі ўсе яго кнігі, якія зацікавілі вялікі свет.

Чым болей яго друкавалі, чым болей аб ім пісалі ў Маскве, у Еўропе, тым цяжэй прыходзілася мясцовай партыйнай і ваяцкай хеўры. Быкаў ім быў ужо не па зубах. Што яны маглі, дык гэта выбіць акно, пазваніць і сказаць гадасць, падскочыць знячэўку на вуліцы.

Пасля з'езда пісьменнікаў, калі Быкаў і Карпюк мелі надта вострыя выступленні, папрасілі, каб я схадзіла да сакратара абкама даведацца, ці пра іх выступленні ўжо данеслі. Я схадзіла. Сакратар сыграў ролю клапатлівага бацькі, сказаў, каб не хваляваліся, усё добра, няхай спакойна застаюцца пры сваіх жонках. Тыя выступленні потым абмяркоўвалі на актывах, асуджалі аўтараў, а Карпюк іх распаўсюджаваў як самвыдат.

Быкаў вырастаў з нашага горада, як падлетак вырастае з адзення. Ён ужо рэдка бываў дома. Асабліва, калі па яго аповесцях пачалі здымаць фільмы. Яму не падабаліся сцэнары і здымкі, але разумеў, што трэба ісці на кампраміс з сабой, каб паладзіць з рэжысёрам.

У Маскве ён быў больш на месцы, чым у Гродне. Акопная проза таксама патрабуе "ротаў" і "батальёнаў". У яго батальёне былі Твардоўскі, Бакланаў, Бондараў, Ананьеў... Аднойчы падараваў мне фота Салжаніцына — сам яго сфатаграфаваў. У замежных паездках з маскоўскімі калегамі таксама знаходзіў роўных сабе пісьменнікаў сусветнай хвалі.

Ён вырастаў і з Беларусі. Гродна для яго рабілася нейкім дачным участкам, куды прыязджалі перакладчыкі, калегі адусюль. Калі гэта быў Макаёнак, то яны запрашалі і мяне павячэраць. Калі Быкаў вяртаўся ў Гродна, званіў мне, і мы сустракаліся на левым беразе Нёмана каля помніка Гарнавых, які на тым месцы загінуў у 1939 годзе. Калі мы выходзілі па званку адначасна, нашы дарогі сходзіліся ў гэтым месцы.

Левы бераг Нёмана быў дзікім, там зручна было ціха размаўляць. У сярэдзіне 70-х надта ўжо збіралі тэчкі пра такіх літаратараў, як Быкаў. Ён паўтараў не раз, што за яго прыватным жыццём сочаць у замочную шчыліну. Ён апавядаў пра маскоўскія падзеі, пра высылкі, псіхушкі.

У той час ЦК практыкавала лісты ў асуджэнне пэўных вялікіх людзей. Быкава пэцкалі гэтымі лістамі, паведамляючы па тэлефоне, што будзе і ягоны подпіс пад лістом. Алесь Адамовіч паўжартам казаў, што Быкаў не баіцца ні ЦК, ні крытыкі, а баіцца Дануты. Але я не спытала ні разу ў яго пра тыя ганебныя подпісы. Мне было лягчэй. Я ж не мела такой славы і ігнаравала партыйных і школьных начальніц, не думаючы пра вынікі. Мусіць, гэта крыху бянтэжыла майго літаратурнага настаўніка, які сам заклаў у маю свядомасць "праграму", а пасля пра гэта забыўся.

Тэмпы яго літаратурнага ўзыходжання былі надта крутыя, але ён не хаваў ні ад каго сваёй працавітасці, прафесійнасці, даваў усім добры прыклад...

Што было б, каб у нас ён не з'явіўся? Сцэнары жыцця піша Бог. Але Быкаў з'явіўся, адбыўся. Ён збіраў вольны вецер і прыцягваў у нашы правінцыйныя скразнякі. Быў прыгожым святам, дзеля якога хацелася выйсці ў горад і яго там сустрэць.

Доўгую дарогу ў літаратуру ён планаваў і прайшоў сам. Нобелеўскую прэмію, мусіць, у той жыццёвы праект не заклаў, улічваючы, што жыве не ў вольным грамадстве, не ў суверэннай дзяржаве.

Каб беларусы былі на ўзроўні сваіх суседзяў, Быкаў мог бы быць першым прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Ён прыехаў паміраць у Мінск, бо верыў у будучыню Беларусі. Народ праводзіў яго ў прытулак вечных сноў, а ён з труны, як Купалаў ганец з паэмы "На куццю", "відзеў, што яны ўсе жывы... Аддайце славу нашу нам! Іх вусны бледныя шапталі"...

Суправаджалі яго да Бога святары абодвух каталіцкіх абрадаў — гэта праоцтва будучай рэлігіі ўваскрэслай Беларусі.

У Гродне расце дуб, пасаджаны Васілём Быкавым, які аберагаюць ягоныя ўнукі, яго жывая кроў. Няхай прадаўжаецца іх род і дае свету новых геніяў, яднае Беларусь...

Гродна.

СПОРТ

У футбольным чэмпіянаце краіны — трохуладдзе

У сямі гарадах Беларусі прайшлі матчы 10-га тура нацыянальнага першынства па футболе ў вышэйшай лізе. Лідэры чэмпіянату атрымалі перамогі. Жодзінскае "Тарпеда" на сваім полі перайграла "Славію" (Мазыр) — 3:1 (Зуеў, 35, 63, 67 — Кліменка, 68). Мінскае "Дынама" выйграла ў Магілёве ў "Дняпра-Трансмаша" — 1:0 (М.Цыгалка, 31), а сталічнае "Тарпеда-СКА" — у гасцях у землякоў з МТЗ-РІПА — 3:0 (Собаль, 15, Доўнар, 57, Макоўскі, 62).

Астатнія вынікі: "Дынама" (Брэст) — "Нёман" (Гродна) — 2:0 (Васілюк, 17, Кавальчук, 67).

"Гомель" — "Нафтан" (Наваполацк) — 2:2 (Георгіеў, 27, Гараўцоў, 88 — Сяднёў, 25, Стрыпейкіс, 74).

БАТЭ — "Лакаматыў" (Віцебск) — 3:2 (Бага, 75, 85, Рубненка, 88 — Калодзін, 49, 58).

"Шахцёр" — "Белшына" (Бабруйск) — 2:0 (Ганчарык, 76, Барэль, 79).

Матч паміж "Зоркай-ВАБДУ" (Мінск) і "Дарыдай" (Ждановічы) адбудзецца 17 чэрвеня.

Становішча каманд: "Тарпеда-СКА", "Тарпеда" (Жодзіна), "Дынама" (Мінск) — па 22 ачкі, БАТЭ — 20, "Шахцёр" — 19, "Славія", "Гомель" — па 18, "Дарыда" — 14 (9 гульняў), "Дынама" (Брэст) — 11, "Зорка-ВАБДУ" — 10 (9 гульняў), "Лакаматыў" — 9, "Дняпро-Трансмаш", "Нёман" — па 8, МТЗ-РІПА, "Нафтан" — па 6, "Белшына" — 5.

Алег РАЯВЕЦ.

Рекламу
не обязательно доставлять в редакцию, ее
МОЖНО
вместе с гарантийным письмом
передать по факсу: (017) 206-69-04.

КРЫЖАВАНКА

«Перамога»

Па гарызанталі: 5.Афіцэрскае званне. 6.Адрывісты гук, шум ад удару. 9.Востры край шашкі. 10.Сукупнасць транспартных сродкаў спецыяльнага прызначэння ў войску. 12.Адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. 14.Удзельнік Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, нацыянальны герой Беларусі. 16.Імя піянера-беларуса, Героя Савецкага Саюза. 17.Сучасны зенітна-ракетны комплекс. 18.Умоўнае абазначэнне невядомай або знарок неназванай асобы. 19.Камандзір танка, экіпаж якога шаснаццаць гадзін змагаўся з ворагам у акупіраваным немцамі Барысаве, Герой Савецкага Саюза. 21.Ёмістасць для паліва ў танку, самалёце і інш. 23.Нанясенне ўдару сваім танкам, самалётам па варожай машыне. 25.Частка ўдарнага механізма ў ручной агнястрэльнай зброі. 27.Беларуская падпольшчыца, Герой Савецкага Саюза. 29.Водная перашкода для наступаючых войскаў. 30.Імклівы напад, атака (перан.). 33.Смутак, няшчасце, мукі, якія прынеслі на акупіраваную Беларусь нямецка-фашысцкія захопнікі. 34.Перадавая пазіцыя абароны.

Па вертыкалі: 1.Пласкадоннае судна або плыт для пераправы цераз раку. 2.Баявы вокліч войск пры імклівым нападзе войск на праціўніка. 3.Генеральны план Гітлера па значным знішчэнні ўсходніх славян, перасяленні ў Сібір і астатніх — анямечванні. 5.Савецкі палкаводзец, які каардынаваў дзейнасць фронтоў пры вызваленні Беларусі. 7.Двойчы Герой Савецкага Саюза, былы камандуючы авіяцыяй Беларускай ваеннай акругі (загінуў у аўтакатастрофе). 8.Воінскае падраздзяленне палка. 11.Тое, што і тэлефакс. 13.Народны паэт Беларусі, аўтар зборніка вершаў "Острите оружие". 15.Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, народны пісьменнік Беларусі, аўтар рамана "Глыбокая плынь". 16.Лётчык-беларус, які стаў першым з беларусаў Героем Савецкага Саюза. 20.Цвёрды мінерал, які выкарыстоўваецца ў тэхніцы. 22.Раман Янкі Маўра. 24.Цэнтр чаго-небудзь (кніжн.). 26.Пастанова вярхоўнага органа ўлады, якая мае сілу закона. 27.Рухавік танка, самалёта. 28.Сканцэнтраваныя ў адным месцы ўзброеныя сілы для рашучага ўдару. 31.Моцны артылерыйскі абстрэл пазіцый, які паслядоўна перамяшчаецца (перан.). 32.Дакумент, які падпісаў Маршал Савецкага Саюза Г.Жукаў аб поўнай капітуляцыі фашысцкай Германіі.

Склаў Уладзімір ГОЛУБ.

Адказы на крыжаванку, апублікаваную ў №105

Па гарызанталі: 2.Ура! 5.Машэраў. 8.Мазурук. 9.Каманда. 11.Іпа. 13.Роў. 14.Камарын. 15.Галун. 16.Талаш. 19.Талаліхін. 22.Слоўнік. 23.Міна. 24.Атам. 25.Букса. 27.Кніга. 28.Сероў.

Па вертыкалі: 1.Картэж. 3.Мазураў. 4.Таварыш. 6.Азімут. 7.Снарад. 8.Мараль. 10.Армада. 12.Васілеўскі. 17.Камса. 18.Бірка. 20.Смірноў. 21.Абарона. 25.Бак. 26."Аса".

Алесь Пушкін — бацька беларускіх Tattoo

Зразумела, гаворка ідзе не пра Аляксандра Сяргеевіча, які хоць і меў беларускія карані, але стаў расійскім класікам і пасля пакутлівага блукання вярнуўся ў сталіцу Бацькаўшчыны ўжо ў забронзавелым выглядзе — помнікам "работы" маскоўскага мэра Лужкова, а пра самую каларытную постаць сучаснага беларускага мастацтва — Алеся Пушкіна, жыхара мястэчка Бобр, што на Міншчыне, а па сумяшчальніцтве — грамадзяніна Сусвету. З тым удакладненнем, што ў цэнтры гэтага Сусвету годна месціцца Беларусь, а ўвесь астатні свет мусіць, згодна з субардынацыяй, пакорліва круціцца вакол яе, як грамада планет вакол Сонца. Дазволю сабе выказаць меркаванне, што на ідэйна-віртуальным узроўні Алесь здзейсніў тое, што ніяк не можа зрабіць на ўзроўні вульгарна-матэрыяльным ягоны цёзка і палітычны апанент Аляксандр. Бо Алесь бачыць у цэнтры Сусвету Беларусь, між тым як Аляксандр — сябе. Акрамя таго, усё бачыць Бог і спрыяе справядліваму.

Гэты ўступ патрэбны, каб патлумачыць ролю і месца Алеся Пушкіна ў сённяшніх культурніцкіх варунках. Яму належыць шэраг навацый, якія аб'ектыўна ўводзяць Беларусь у сусветны культурніцкі кантэкст, ці, прынамсі, даюць спадзяванне на тое, што наша месца там ужо ніхто са спрытных суседзяў не зойме. Апошнім часам Алесь прыйшоў да высновы, што за глабальнымі праектамі нельга забываць і пра канкрэтнага паспалітага беларуса. Добрая справа — распісаць храм, аздобіць тэатральны спектакль альбо кнігу вершаў, напісаць палатно ці зладзіць перформанс, якія стануць для грамадства тэстам на маральнасць. Але ж канкрэтны чалавек сярод побытавага тлуму можа застацца да ўсяго гэтага абыякавым.

Выйсце на гэтага ўмоўна-канкрэтнага чалавека Алесь вырашыў здзейсніць праз сапраўды народную форму мастацкай творчасці, якой з'яўляецца татуіроўка (татуаж, tattoo). Доўгі час класікаю жанру тут былі брутальныя тэксты накшталт "Не забуду мать родную" альбо "Нет в жизни счастья", часта ў спалучэнні з вульгарна-эратычнымі малюнкамі. Увогуле гэтае мастацтва моцна засмечана крымінальнай рамантыкай. А зараз яе змяняе маргінальная эстэтыка "масавай культуры". І тое, і другое для Алеся непрымальнае. Цела, як і жыццё, даецца чалавеку аднойчы. І зусім не для таго, каб крэмзаць яго ідыёцкімі тэкстамі і выявамі.

Дзеля прапаганды здаровага напрамку ў беларускім "tattoo" беларускі Пушкін здзейсніў перформанс-прэзентацыю свайго тэматычнага зборніка **"Tattoo на тэмы творчасці Уладзіміра Караткевіча"**. Мастак прапаноўвае гледачу, схільнаму да мастацкіх эксперыментаў над уласным целам, татуажную трактоўку вобразаў і сюжэтаў са спадчыны слыннага беларускага рамантыка — "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чазенія", "Краіна Цыганія", "Ладдзя Роспачы"... Шэраг іншых сюжэтаў маюць да творчасці Караткевіча дачыненне ўскоснае, але да беларускай патрыятычнай справы — непасрэднае. Гэта "Пагоня", "Белая вежа", "Полацкая Сафія".

Паколькі справу пераўтварэння свету на добры лад трэба пачынаць з сябе самога, Алесь прадэманстраваў гасцям прэзентацыі татуіроўку свайго аўтарства з выяваю Рагнеды, маленькага Ізяслава з мячом у руцэ, крыжам Святой Еўфрасінні і надпісам "Беларусь перадусім", выкалатую на сваім целе, над сэрцам.

Прыгаданая імпрэза адбылася 15 чэрвеня падчас урачыстага адкрыцця "Дызайн-біржы" ў выставачным цэнтры на вуліцы Я.Купалы. Працаваць "біржа" будзе да 18 чэрвеня. Такім чынам, цікаўныя змогуць пазнаёміцца і з новай з'явай у творчасці Алеся Пушкіна (стэнд мастака ў канцы залы), і з тым, што яшчэ ёсць вартага ў нашым візуальным мастацтве.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Памятаем Еўфрасінню Полацкую!

У Мінску, у Палацы мастацтва, адкрылася выстава жывапісу ўдзельнікаў X дзіцячага міжнароднага пленэра, прысвечанага нябеснай заступніцы Беларусі Еўфрасінні Полацкай.

Гэтая творчая акцыя праводзілася з 4 па 15 чэрвеня ў Мінску і Полацку пры падтрымцы Беларускага саюза мастакоў, Міністэрства адукацыі, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці вучняў і Беларускага дзіцячага фонду.

У экспазіцыі — каля 60 работ, у якіх адлюстраваны ўвесь свет дзіцячых уражанняў: прырода ў розныя поры года і розны час сутак, самотны спадарожнік, храмы і саборы, чароўны ручай і дрэва, казачныя замкі і цемрадзь невядомасці, наваколлі Полацка, дно мора і бераг Заходняй Дзвіны, агонь і рознакаляровы букет, паласатае аленяня і песні салаўя, "дастаткова вясёлы кот" і "кот, які гуляе", "вусень шчасця" і танец матылькоў, сон і месяцавае святло, восеньскі сад і пустыня, міраж і прароцтва, дарога і адбітак.

Выстава будзе працаваць да 21 чэрвеня.

Марат ГАРАВЫ.

18
чэрвень
ПЯТНІЦА
Уск. 4.37 Зах. 21.45
Даўж. дня 17.08
Маладзік
17 чэрвеня

ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ

Куплю

Антиквариат! Награды СССР, иконы, картины, бронзовые, фарфоровые статуэтки, книги, монеты до 1917-го, купюры США до 1930 года, кортик, саблю, немецкие трофеи. **Тел.: 282-75-52, 8-029-482-75-52.**

Продаю

Паркет: дуб 5 м², ясень 10 м², недорого. **Тел.: 201-88-74, (8-0296) 11-88-74.**

Разное

Шукаю аднадумцаў, якім неабыякавы лёс беларускай нацыі ў сэнсе здароўя. Ёсць канкрэтная прапанова. **Тэл.: (017) 249-51-97, (8-029) 753-35-24. Кацярына Пятроўна.**

Пятница, 18 июня

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00 23.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!"
07.30, 08.30, 19.45 "Деловая жизнь".
08.50 Выпускной экзамен по физике за курс средней школы в общеобразовательных и специальных заведениях.
09.05 Футбол. Чемпионат Европы. Хорватия—Франция.
11.05 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.15 "Земельный вопрос".
12.40 "Государственная граница". "Мирное лето 21-го года". Сериал.
14.05 "Белорусские мастер-классы Николая Баскова".
14.15 "Все нормально, мама!".
15.10 "Великий Мерлин". Сериал.
16.05 "5х5".
17.05 "Звездный дождь".
18.05 "Специальный репортаж".
18.20 Футбол. Дневник чемпионата Европы.
18.55 Футбол. Чемпионат Европы. Болгария—Дания.
20.55 "100 шагов к Олимпу".
21.00 "Панорама".
21.50 "Специальный репортаж".
22.00 "Государственная граница". "Восточный рубеж". Сериал.
23.30 Футбол. Чемпионат Европы. Италия—Швеция.
01.15 "Клип-обойма".

ОНТ

По Минску и Минской области с 09.05 до 15.50 — техническая профилактика.
07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.30 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
09.05 "Клюн". Сериал.
09.55 "Дом". Реалити-шоу.
10.40 Мультсериал.
15.50 Прогулки с чудовищем". Док.фильм.
16.50 "Большая стирка".
18.10 "Сканер".
18.20 "Без срока давности".
18.50 "Поле чудес".
20.00 Время.
21.05 "Телевизионная национальная премия в области популярной музыки-2004".
23.45 "Королевская кобра". Триллер.

РОССИЯ

07.45 "Гонки по вертикали". Сериал.
08.55 "Что хочет женщина". Ток-шоу.
09.50, 12.45 "Вести. Дежурная часть".
10.00, 16.00, 18.00 "Вести".
10.30, 18.30 "Местное время. Вести — Москва".
10.50, 16.10 "Команда". Сериал.
11.50 "Ундина". Сериал.
17.05 "Комиссар Рекс". Сериал.
18.50 "Соммерсби". Драма.
21.00 Концерт.
22.50 "Непрощенный". Вестерн.

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.00 Новости.
08.10 "Мгновение вечности".
08.30 "Другие танцы".
08.35 "Рафферти". Сериал.
09.35 "Свет далекой звезды. Анатолий Лелявский".
10.05, 18.25 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.30, 21.15 "Грешная Анхелика". Сериал.
11.15, 12.50 "Обычный необычный день".
11.50 "Руины стреляют". Худ.фильм.
13.20 Мультфильмы.
14.10 "Время кино".
15.05 "Учительская".
15.15 "Эх, анекдот, анекдот".
15.30 "Из архивов БТ". "Трибунал".
16.55 "Война и мир". "Пьер Безухов". Киноэпопея.
18.50 "Никто не заменит тебя". Драма.
20.15 "Колыбельная".
20.30 "Дела семейные".
22.05 Баскетбол. НБА. Финал.

НТВ

09.00, 11.00, 16.00, 18.00 "Сегодня".
09.25 "Фактор страха".
10.20 "Страна советов".
14.35 "Принцип домино". Ток-шоу.
16.30 "Дикий мир: борьба за выживание".
17.35 "Протокол. Расследование".
18.35 "Свобода слова". Ток-шоу.
19.55 "Никогда не говори "никогда". Приключения.
22.45 Бокс. Лучшие бои. Костя Цзю — Бен Таки.

СТВ+RenTV

06.25, 18.00 Минщина. Люди, события, факты".
06.40 "Утро столицы".
07.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
07.50, 20.00 "СТВ-спорт".
С 08.00 до 16.00 — техническая профилактика.
16.05, 23.10 "Технология".
16.15 "Тема дня".
16.50 "Турпоход".
17.00 "Классика юмора".
18.15 "Светская хроника".
18.30 "Ангел на дорогах". Сериал.
20.10 "Минск и минчане".
20.20 "Добрый вечер, малыш...".
20.35 "Автопанорама".
20.55 "Мои пять жен". Комедия.
23.20 "Реактивный бокс".
23.45 "Новости СНГ".
00.00 "Детям до 16-ти". Мелодрама.

8-Й КАНАЛ

07.00, 17.00 "Моссад". Сериал.
07.50, 17.50, 21.00 "Телемагазин".
08.00 "Доктор Дулитл". Комедия.
09.30 "Знакомьтесь, Беларусь!"
09.45, 19.50 "Любовники пустыни". Сериал.
10.30, 21.10 "Джеймс Бонд — агент 007". Приключенческий фильм.
16.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
18.00 "Фантомас разбушевался". Комедия.
19.40 "К-видео" — "Топ-8".
20.45 "Вечарніца".

ТВ ЦЕНТР

**04.